КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 6 (229) ◂ 11 лютага ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**«САЛЁНАЯ» ВАЛЮТА**

Стар. 6

**СТРАХ — НЕ ПРЫЧЫНА ПАРАЗЫ**

Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД) зрабіў аналіз поствыбарчых настрояў у беларускім грамадстве

Стар. 5

**ЕГІПЕЦКАЯ ВАНДЭЯ**

Пра асаблівасці егіпецкай контррэвалюцыі журналіст «НЧ» Алег Новікаў гутарыць з маскоўскім палітолагам, спецыялістам па Усходу Маркам Васільевым

Стар. 11

**АРАБСКАЯ ДЖЭЙН ОСТЫН**

Стар. 14

ISSN 2218-2144
9 772218 214401 10006

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ЖЫЦЦЁ БАРЫСА ПЯТРОВІЧА**

Нарыс Аляксандра Тамковіча з новага цыклу «Лёсы. Працяг»

МЕРКАВАННЕ

# СТАНЦЫЯ ПРЫЗНАЧЭННЯ...

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Як паведамілі СМІ, на сваім пасяджэнні 1 лютага Савет міністраў не абмяркоўваў мэты і задачы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Іх раней вызначылі іншыя людзі.**




У каментарах тлумачыцца: гэта зрабіў сам народ праз IV Усебеларускі народны сход, які ўхваліў пазіцыі, вызначаныя прэзідэнтам краіны. Для тых, хто не ведае, — вышэйшага дзяржслужбоўца Беларусі завуць Аляксандрам Лукашэнкам.

На яго думку, праз пяць гадоў беларусы павінны жыць як еўрапейцы. Гэта вельмі тонкі падыход. Бо прапануецца менавіта жыць, а не быць. Задача і складаная, і адначасова далікатная. Прыкладам, вяскоўцы добра ведаюць — дай свінні волю, яна з'есць тое ж, што есць чалавек. Да апошняга калівa і да апошняй кроплі. Але ж паппарасі свінню быць чалавекам...

Не трэба тлумачыць, што Міхаіл Мясніковіч, новы старшыня нашага ўрада, трапіў у даволі складаную сітуацыю: яму трэба падабраць інструменты для выканання гэтай не чуванай у свеце місіі. Надзея на тое, што Мясніковіч, які да гэтага часу паспяхова вырашыў амаль што тузін вельмі складаных задач, справіцца і з гэтай. Не горай за іншых акадэмікаў. Народная селекцыя, каб вы ведалі: калі вам падабаецца салодкая бэра, то не чакайце міласці ад вартаўнікоў, сарвіце і з'ешце!

Зразумела, гэта чысцюткі плагіят. Калі па-добраму, то за выкарыстанне колішняга ноўхаў трэба было б нейкую драбязу адсылаць нашчадкам Івана Мічурына ў расійскі Казельск. Але ж бягучы год (як тут не ўспомніць часы ВКП(б)-КПСС — год вырашальны, год канчатковы) абвешчаны ідэолагамі годам прадпрымальнасці. Не бракуе, што яшчэ ўчора прадпрымальнікаў абзывалі «вашывымі блохамі». Лозунг дня: «Толькі бізнэс, нічога асабістага!» І таму фактычны плагіят падаецца як працяг вельмі паспяховай колішняй ленінскай новай эканамічнай палітыкі — НЭПу.

НЭП дык НЭП. Калісьці з яго дапамогай Расію ператварылі ў СССР, з турмы народаў зрабілі імперыю зла. А зараз? Вось што распавёў Мясніковіч: «Усе праграмы і мерапрыемствы павінны забяспечыць выхад Беларусі па ўзроўню і якасці жыцця на сярэднееўрапейскія паказчыкі, як у Польшчы і Чэхіі. Выкананне гэтых праграм, усе лічбы і працэнты павінны даць у выніку такі плён».

Не ведаю, як там у Чэхіі. Пасля ўводу савецкіх танкаў у Прагу ў жніўні 1968 года гэту краіну ад нас закрылі так шчыльна, што цалкам не адкрылі да гэтага часу. Што да Польшчы, то там ужо калісьці было, як зараз у нас — у кагo болей, той і пан. Навідавоку: у слуг народа ўсяго болей, чым у гаспадара. І пануюць у нас над народам не абамы з меркелямі, не абрамовічы нават, а простыя шклоўскія хлопцы, у якіх ніколі не было ні кала, ні двара. У сэнсе, уласных. А што зараз — бачна ўсім.

«Томитесь, как наложницы в гареме...» — пасміхаўся з такіх Уладзімір Высоцкі. Нудна ім стала есці скаромнае ў адзіноце. Вырашылі падзяліцца з народам? Кажуць, у вас жа скарб пад нагамі, а вы яго топчаце. Ад таго і галеча. Трэба ўзяць рыдлёўкі (зноў рыдлёўкі!) ды адкапаць.

Гучыць аптымістычна, але чуецца стары анекдот пра дыстрофіка: «Сяэтра, забі камара!..» Вось што трэба зрабіць, каб жыць па-новаму, па словах віцэ-прэм'ера Сяргея Румаса, калі іх пералажыць на «нармальную чалавечаю мову», як гэта некалі адзін выкшталцоны палітык рабіў з «нармальнымі чалавечымі яйкамі». Значыцца, так. Трэба, каб беларуская курыца дагнала па яйканоснасці польскую, каб карова давала столькі ж малака, што і чэшская, каб беларускія сыры зраўняліся па якасці са швейцарскімі, каб піва з айчыннага соладу было не горай за пільзенскае. Неабходна, каб беларускі калгаснік па прадукцыйнасці працы дагнаў галандскага фермера. А яшчэ трэба, каб хто даў грошы на новае прамысловае абсталяванне і тэхналогіі, каб была магчымасць выпускаць якасную прадукцыю.

Нехта спытаецца, а навошта такі тлум — жывем паціху і сваё «крышку мясца» (у сэнсе дэмакратыі) маем. А таму (у перакладзе на чалавечую мову), адказвае спадар Румас, што зараз знешнегандлёвай выручкі ад продажу айчынных тавараў не хапае нават на закупку замежнай сыравіны і энерганосьбітаў, лекаў ды кавы з гарбатай. Зноў жа, як у старым анекдоце: «Вам ежы хапае? — Хапае, нават застаецца. — А што робіцца з астаткамі? — З'ядаем, і яшчэ больш хочацца».

Дылема: чым больш не зарабляем, тым больш хочацца. Прыкладам, у 2009 крызісным годзе адмоўнае знешнегандлёвае сальда склала 7,3 мільярда долараў. А ў 2010-м, калі эканоміка, як нас пераконваюць, паздаравела, і ўдалося нават збольшага распрадаць складскія запасы, атрымалі мінус 9,6 мільярдаў. Выходзіць, што прыплюсавалі да мінуса яшчэ 2,3 мільярда. Прыкладна столькі Лукашэнка мяркуе «ўзяць» ад продажу Салігорскага калійнага камбінату...

Нам кажуць, што пакуль не ўсё атрымліваецца. А вось зараз, пэўна, усе атрымаецца. Не давядзі Гасподзь! Пры такой вышэйшай арыфметыцы, «мінус на мінус» ніколі не дасць плюс.

Як сказаў бы лекар: «Летальны зыход непазбежны, паведаміце родным».

Паведамляем: «Заставайцеся спакойнымі. Наш цягнік набірае хуткасць. Станцыя прызначэння — «Катастрофа».

АКЦЫЯ

# «АДПУСЦІЦЕ ІХ НА СВАБОДУ!»

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Ужо больш за 5 тысяч чалавек падпісаліся ў інтэрнэце за вызваленне палітвязняў у Беларусі падчас акцыі, якую ініцыявала ў Германіі дачка Міколы Статкевіча Кацярына.**

Назва акцыі «Lasst sie frei» перакладаецца як «Адпусціце іх на свабоду». Сярод тых, хто паставіў свае подпісы прадстаўнікі ўсіх нямецкіх партый і кіраўнікі фракцый у парламенце, акцёры і мастакі, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры Гюнтэр Грас.

На днях сюжэты пра падзеі ў Беларусі і пра Кацярыну Статкевіч выйшлі на нямецкім тэлебачанні і радыё. Буйнейшая тэлерадыёкампанія ARD паказала рэпартаж на канале BR у прайм-тайм (18.00). Сюжэт пра зняволеных і лёс Міколы Статкевіча прагучаў таксама на радыёканале «Bayern 1» і навінавым радыёканале «Bayern 5 aktuell».

«Больш за ўсё мяне непакоіць тое, што я нічога не ведаю, што зараз адбываецца з маім бацькам, — сказала Кацярына ў інтэрв'ю тэлеканалу BR. — Існуе поўная інфармацыйная блакада паміж бацькам і астатнім светам. І гэта няведанне робіць бяссільнымі, бездапаможнымі».

А Марылуізе Бек, каардынатарка ўсходнееўрапейскай палітыкі фракцыі «Саюз 90/Зялёныя», адзначыла ў інтэрв'ю: «Гэта папросту розуму недаступна, што ў самым цэнтры Еўропы правы народа так нахабна топчуцца. І здзяйсняюцца такія злачынствы супраць чалавечнасці. І гэта павінна ўсіх нас датычыцца».

Кацярына Статкевіч жыве ў Германіі з 2002 года. Яна працуе на «Audi» ў баварскім горадзе Інгальштадт і піша доктарскую дысертацыю па вытворчасці і лагістыцы. Сваімі выступамі ў СМІ і акцыяй па зборы подпісаў у інтэрнэце яна дамагаецца і вызвалення свайго бацькі.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ДРУГАЯ ХВАЛЯ РЭПРЭСІЙ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Грамадзян, якія адбылі адміністрацыйныя арышты, чакае другая хваля рэпрэсій.**

Пра гэта заявілі праваабаронцы з камітэта абароны рэпрэсаваных «Салідарнасць». Зараз інфармацыя павелічэнне выпадкаў звальненняў і адлічэнняў па палітычных матывах.

З 19 снежня 2010 гады па 25 студзеня 2011 звольнены з працы 11 чалавек. Адлічаны (азнаёмлены з загадам пра адлічэнне) 2 студэнты з прафесійна-тэхнічных каледжаў (Мінскі дзяржаўны політэхнічны каледж і Мінскі дзяржаўны вышэйшы радыётэхнічны каледж). А таксама студэнт з Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта. 61 студэнт, які ўдзельнічаў у акцыі пратэсту пасля выбараў, знаходзіцца пад пагрозай адлічэння з вышэйшых навучальных устаноў.

Як кажуць праваабаронцы, у параўнанні з папярэднімі гадамі адлічэннем спрабуюць надаць менш палітызаваны кантэкст. Зрабіць рэпрэсіі не такімі прыкметнымі. Напрыклад, не дапускаюць да іспытаў студэнтаў, якія прапусцілі адзін ці некалькі залікаў (з-за адміністрацыйнага арышту). А калі дапускаюць, то крытычна абмяжоўваюць тэрміны здачы прадметаў. Зніжаюць ацэнкі. Прапануюць напісаць заяву на адлічэнне па ўласным жаданні, матывуючы гэта тым, што так будзе менш праблем.

«Штодзённыя звароты студэнтаў, на якіх аказваюць ціск, сведчаць пра распачатую так званую другую хвалю рэпрэсій», — заявілі праваабаронцы «Салідарнасці».

З лютага звольнены Пётр Мігурскі, даверанная асоба экс-кандыдата ў прэзідэнты Уладзіміра Някляева. Ён, кандыдат эканамічных навук, працаваў у Магілёўскім дзяржаўным універсітэце харчавання. «Ці вы працуеце ў ВНУ, ці займаецеся палітыкай», — паставілі яму ўльтыматум. Пётр Мігурскі напісаў заяву на звальненне.

У офісе Брэсцкай абласной арганізацыі АГП супрацоўнікі КДБ правялі 8 лютага ператрус. Ён адбыўся ў межах расследавання крымінальнай справы аб «масавых беспарадках» у Мінску 19 снежня. Забралі сістэмны блок кампутара. Брэсцкую грамадскую актывістку Юлію Пашко дапыталі наконт тых падзей у абласным упраўленні КДБ. А Уладзіміра Лемеша з Салігорска, давераную асобу экс-кандыдата Андрэя Саннікава, гэтым разам дапыталі ў Савецкім РУУС Мінска. Раней ён пабываў на допыце ў салігорскім КДБ.

У райцэнтры Гарадок Віцебскай вобласці КДБ 7 лютага правёў допыт старшыні суполкі БНФ Леаніда Аўтухова. Ён панёс дакументы на замену пашпарта ў міліцыю, дзе яму і паведамілі, што ў супрацоўнікаў КДБ «ёсць размова». 19 снежня актывіста ў Мінску не было. А ў сталіцы дапыталі кіраўніцу моладзі БХД Любоў Каменеву. Адваката з ёй не пусцілі. Яе калега, актывіст БХД і дэпутат райсавета Аляксей Цюлькоў, быў дапытаны ў аддзяленні КДБ у Асіповічах.

А ў кіраўніка Гомельскай абласной арганізацыі партыі «Справядлівы свет» Уладзіміра Сякеркі правялі вобыск 5 лютага. Гаспадар у гэты час быў на партыйным сходзе ў Рэчыцы, у кватэры знаходзілася жонка. Чэкісты забралі кампутар.

СПРАВА

# НЕПАПРАЎНЫ АЎТУХОВІЧ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**8 лютага споўнілася два гады з дня арышту прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча. Ён увайшоў у лік 15 сусветна вядомых палітзняволеных, спіс якіх склала праваабарончая арганізацыя Freedom House.**

У Івацэвіцкай калоніі ён не падпісаў абавязацельства, што паўстае на «шлях выпраўлення». «Нават там ён супрацьстаіць гэтай сістэме, — адзначыў праваабаронца Алег Волчак. — Як і раней, ён заяўляе, што не прызнае віны. Вядома, гэта начальству не падабаецца. Але яно нічога зрабіць не можа, бо ўсе ведаюць, хто такі Аўтуховіч. І ведаюць яго баявы шлях і яго барацьбу за справядлівасць».

Волчак нядаўна размаўляў з Аўтуховічам. Вязень выказаў падзяку ўсім, хто збіраў грошы на лячэнне зубоў. «Для яго зараз самае складанае — гэта тое, што ў сям'і катастрафічнае фінансавае становішча. Жонка не працуе, у яе праблемы са здароўем. Прадае маёмасць».

Вязень атрымлівае незалежныя газеты і дае чытаць іншым. «Прасіў перадаць, што дэмакратычным сілам трэба аб'яднацца, — распавёў Алег Волчак, — і змагацца адзіным фронтам. І каб яны разумелі, што ёсць людзі, якія чакаюць свабоды ад іх рашэнняў і дзеянняў. Таму што на зонах вельмі шмат людзей сядзяць па несправядлівых прысудах. І ў іх ёсць надзея вызваліцца датэрмінова ці быць апраўданымі толькі дзякуючы дэмакратычным пераменам».

P.S. Лісты да зняволенага лепш дасылаць з паведамленнем, каб быць упэўненымі, што яны дайшлі, на адрас: 225293, г. Івацэвічы-3, Папраўчая ўстанова «Папраўчая калонія № 5», Атрад № 13, Брэсцкая вобласць, Аўтуховічу Мікалаю Мікалаевічу

ВЫНІКІ

# КОЖНЫ ЧАЦВЁРТЫ

Генадзь КЕСНЕР

**Прадстаўнікі Міжнароднай назіральнай місіі Камітэта міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі, Фонду развіцця прававых тэхналогій, Цэнтру прававой трансфармацыі, іншых праваабарончых арганізацый агучылі вынікі даследавання анкет са сведчаннямі затрыманых падчас і пасля масавай акцыі 19 снежня.**

Як паведаміў сябра Місіі, член праўлення Міжнароднага «Мемарыялу» Ігар Сажын (Расія), падчас даследавання анкеты добраахвотна запоўнілі 260 затрыманых; даследчыкі паспелі апрацаваць 205. Рэспандэнтамі былі грамадзяне ва ўзросце ад 18 да 61 гадоў, сярод якіх — 43 жанчыны і 162 мужчыны.

«Мы сцвярджаем, што найбольш жорстка і найбольш масава прадстаўнікі ўлады прымянялі гвалт і жорсткасць пры затрыманнях. Гвалт прымяняўся да кожнага чацвёртага затрыманага, пры гэтым акты гвалту суправаджаліся абразамі і прыніжэннямі людзей, — канстатаваў Ігар Сажын. — Асноўная частка затрыманых, паводле іх сведчанняў, не аказвала пры гэтым ніякага супраціўлення, у шэрагу выпадкаў людзі стаялі з узнятымі рукамі, чым паказвалі, што гатовыя падпарадкавацца прадстаўнікам дзяржавы. Самі ж прадстаўнікі закону ў кожным шостым выпадку пры затрыманні не мелі знакаў адрознення і нават хавалі свае твары пад маскамі».

Па словах Ігара Сажына, колькасць выпадкаў гвалту пры ўтрыманні схопленых у спецтранспарце, у месцах афармлення пратаколаў і ў судах некалькі змяншалася, але істотна павялічвалася колькасць актаў прыніжальнага і жорсткага абыходжання. «Затрыманых працяглы час утрымлівалі ў пераповненым спецтранспарце, у прыніжальных позах — тварам долу, тварам да сцяны, заклаўшы рукі за спіну ці за галаву. Затрыманым не давалі доступу да пітной вады, па шмат гадзін адмаўлялі ў магчымасці наведаць прыбіральню, не аказвалі дапамогі людзям з цяжкімі траўмамі, — падкрэсліў Сажын. — Пры гэтым варта адзначыць, што дадзеныя спосабы прыніжэння перыядычна суправаджаліся асобнымі ўспышкамі гвалту з боку прадстаўнікоў улады».

Як адзначыла кіраўнік Цэнтра прававой трансфармацыі Алена Танкачова, вынікі даследавання анкет затрыманых будуць прадстаўлены для рэагавання ў адпаведныя дзяржаўныя структуры ў якасці доказу неправамерных дзеянняў прадстаўнікоў дзяржавы ў дачыненні да ўдзельнікаў мірнай акцыі з мэтай, каб «пазбегнуць падобнага падчас аналагічных мерапрыемстваў».

ЗАКЛІК

# ВІТАЛЮ СІЛІЦКАМУ ПАТРЭБНА ДАПАМОГА!

У ліпені 2010 года Віталю Сіліцкаму дыягнаставалі рак правай ныркі. Урачы выдалілі хворы орган, але ў пачатку года хвароба вярнулася метастазамі.

Зараз дырэктару Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў патрэбна дарагое лячэнне. Адзіныя даступныя ў Беларусі лекі, якія могуць прыпыніць распаўсюджванне ракавых клетак па арганізме, Sutentin, каштуюць 8 тысяч долараў на месяц. Віталь ужо распачаў курс лячэння. Калі лекі будуць дапамагаць, далей ён будзе атрымліваць іх бясплатна. Між тым, існуе патрэба прымаць і іншы прэпарат, каб не залежаць ад паставак лекаў у Беларусь.

Акрамя таго, дзякуючы дапамозе сяброў, Сіліцкага пагадзілася прыняць на кансультацыю адна з бельгійскіх клінік. Калі кансультацыя пройдзе паспяхова, урачы возьмуцца за лячэнне, яго курс будзе дарагім.

Офіс за дэмакратычную Беларусь разам з арганізацыяй Pact (міжнародная некамерцыйная дабрачынная арганізацыя) адкрылі ў Бельгіі і ва Украіне банкаўскія дабрачынныя рахункі для збору фінансавай дапамогі Віталю Сіліцкаму.

Дапамагчы калегу можна, пералічыўшы грошы на яго лячэнне:

**БЕЛЬГІЯ**: Bank ING, Branch Sablon, 20, rue de la Regence, 1000 Brussels, Belgium. Рахунак на імя: Office for a Democratic Belarus. Рахунак: 363-0779606-57, IBAN: BE09 3630 7796 0657 BIC (SWIFT): BBRUBEBB Payment details: donation for Vitali Silitski

**УКРАІНА**: Бэнэфіцыятар: Nataliia Karchevska, Account#: 2620 9 201476957, Beneficiary's bank: OTP Bank, 43 Zhylyanska Str., Kyiv, 01033, SWIFT code: OTPVUAUK

ЗВАРОТ

# НАВУКОЎЦЫ ЗА ФЯДУТУ

Андрэй РАСІНСКІ

**Расійскія навукоўцы з Інстытута вышэйшых гуманітарных даследаванняў звярнуліся да Аляксандра Лукашэнкі з просьбай вызваліць Аляксандра Фядуту. Пра гэта паведаміла дацэнт інстытута Наталля Мазур.**

У лісце, адпраўленым у мінскую адміністрацыю, гаворыцца: «Арышт А. І. Фядуты паставіў пад пагрозу зрыву выхад тома, прысвечанага культурным сувязям Расіі і Францыі, у якім наш калега з'яўляецца актыўным супрацоўнікам. Каб пазбегнуць зрыву міжнароднага праекта, мы горача просім Вас спрыяць змене меры стрымання для А. І. Фядуты — з турэмнага зняволення на хатні арышт».

Сярод падпісантаў звароту — вядомыя навукоўцы: дырэктар інстытута Сяргей Сярэбраны, філосаф Наталля Аўтаномава, славісты Андрэй Зорын і Аляксандр Іваніцкі, гісторык Ніна Брагінская.

Гэта не першы ліст расійскіх гуманітарыяў у абарону мінскіх вязняў. Адразу пасля 19 снежня ў сеціве быў распаўсюджаны падпісаны многімі навукоўцамі адкрыты ліст, які заклікаў вызваліць арыштаваных.

Гэтым разам зварот адпраўлены поштай у Адміністрацыю Лукашэнкі.

«Калі не атрымаем адказу, тыдні праз два напішам паўторна, — кажа Наталля Мазур, — каб ведалі, што пра чалавека не забыліся і ў Маскве».

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# РАЗБОРКІ. ПАЧАТАК




Сяргей САЛАЎЁЎ

**Апазіцыя ачуняла ад прэзідэнцкіх выбараў. Прынамсі, пачалося тое, што абяцалі прадстаўнікі і лідары палітычных партый. Пачаліся «разборкі» і чысткі шэрагаў ад «недабранадзейных элементаў».**

У панядзелак Нацыянальны камітэт Аб'яднанай грамадзянскай партыі выказаў вотум недаверу намесніку старшыні АГП Яраславу Раманчуку. Яго далейшы лёс вырашыць з'езд партыі. Праўда, статус яго ў якасці намесніка зараз вельмі намінальны. З плямай недаверу не вельмі і панаместнічаеш.

У любым выпадку, раней Раманчук заяўляў, што яго партыйная дзейнасць больш не цікавіць. У палітыку ён нагуляўся і зараз мае намер вярнуцца да сваёй эканамічна-даследчыцкай дзейнасці. Дый да з'езду АГП трэба дажыць.

А вось з міжнародным сакратаром АГП, якім да гэтага пасяджэння з'яўляўся кіраўнік штабу Уладзіміра Някляева Андрэй Дзмітрыеў, усё значна прасцей. Дзмітрыева турнулі з пасады за тое, што ён падтрымліваў Някляева і не падтрымліваў Раманчука.

Але, думаю, Дзмітрыеў не вельмі засумаваў з нагоды такога рашэння Нацкама. Па-першае, ён застаўся сябрам АГП і пры жаданні зноўку можа дарасці да міжнароднага сакратара партыі. А па-другое, у яго зараз і без партыі праблемаў хапае: са следчымі, з крымінальнай справай, з аднаўленнем дзейнасці кампаніі «Гавары праўду» і гэтак далей.

Працягвае весяліцца Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада). На тыдні з яе шэрагаў зноў быў выключаны былы лідар партыі Анатоль Ляўковіч. У чарговы раз Ляўковіч сваё выключэнне з партыі не прызнаў, матывуючы тым, што яго выключыла не суполка, а камітэт БСДП (Грамада) Маскоўскага раёна Брэста.

Дарэчы, невядома, «былы» кіраўнік партыі Ляўковіч, ці не. На апошнім з'ездзе партыі, што адбыўся ў кастрычніку 2010 года, ён не вылучаў сваю кандыдатуру на пасаду старшыні. Што, дарэчы, не перашкодзіла яму не прызнаць вынікаў з'езда і далей сцвярджаць, што ён застаецца старшынёй партыі.

Пакуль апазіцыянеры сварацца паміж сабой, Аляксандр Лукашэнка ўзяў тайм-аўт. Гэты тыдзень ён са сваім бліжэйшым атачэннем і 6-гадовым сынам Мікалаем бавіць час на расійскім курорце Сочы. Інтэрнэт-газета sochi-24.ru піша, што кіраўнік Беларусі ўзяў кароткатэрміновы адпачынак, падчас якога праверыць ход рэалізацыі праекта ўзвядзення ў горналыжным цэнтры «Красная паляна» біятлоннага комплексу, лыжаролернай трасы і гатэлю. Аднак, паводле паведамленняў таго ж выдання, Лукашэнка практычна не спускаецца з гор, таму, чым ён там займаецца, публіка не ведае.

Затое вядома, чым тут займаюцца ягоныя падначаленыя. Калі б Лукашэнка гэта пабачыў, ён бы задумаўся: а ці не сабатаж гэта?

Яшчэ нядаўна кіраўнік дзяржавы і галоўны банкір побач сядзелі на залатых злітках і разважалі пра тое, наколькі іх будзе больш у 2015 годзе. А на бягучым тыдні Пракаповіч заявіў: «Нацыянальны банк Беларусі сумняваецца ў магчымасці рэалізацыі закладзенай у праект Нацыянальнай праграмы развіцця экспарту на 2011–2015 гады задачы па выхадзе на станоўчае сальда знешняга гандлю да канца пяцігодкі». «Сёлета тэмп рост экспарту павінен скласці 115,9%, а імпарту — 115,8%, розніца 0,1%. Экспарт і імпарт растуць аднолькавымі тэмпамі, — падкрэсліў Пракаповіч, звяртаючыся да кіраўніка МЗС Сяргея Мартынава. — Дзе гарантыі, што не будзе тое, што і раней? У праграме мінулай пяцігодкі мы планавалі рост тэмпу экспарту над імпартам, а ў цяперашняй праграме мы гэтага не плануем, пачынаючы з першага года рэалізацыі».

Паводле слоў Мартынава, з ведамствамі і рэгіёнамі ўзгоднены прагнозныя паказчыкі па росце экспарту, закладзеныя ў праграме. Разам з тым «не ўсе пацвердзілі гатоўнасць выйсці на гэтыя параметры». У прыватнасці, канцэрн «Белбіяфарм» гатовы павялічыць экспарт фармацэўтычнай прадукцыі за пяцігодку ў 2,5 разы, у той час як у праекце праграмы вызначана павелічэнне ў чатыры разы. «Канцэрн пацвердзіў гатоўнасць забяспечыць выкананне задання пры ўмове гатоўнасці мясцовых органаў улады падключыцца да гэтай працы», — адзначыў кіраўнік МЗС. Паводле яго слоў, такая ж карціна назіраецца па шэрагу іншых ведамстваў.

9 лютага адчыніўся 18-ты Мінскі кніжны кірмаш. Адкрылі яго міністр інфармацыі Алег Пралянскоўскі, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Аляксандр Радзькоў і пасол Германіі ў Беларусі Крыстаф Вайль. Уніклівыя журналісты заўважылі, што пры аглядзе экспазіцый чыноўнікі зайшлі на стэнд выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя», дзе, акрамя кніг, былі і гарэлка з агуркамі. Там Радзькоў з Пралянскоўскім і хлопнулі па пяцьдзясят, парушаючы Дэкрэт прэзідэнта №1 пра дысцыпліну і п'янства на працоўным месцы.


Photo.ByMedia.Net

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### УЛАДЗІМІР АСІПЕНКА



Скончыўся тэрмін адбыцця пакарання аднаго з фігурантаў гучнай справы аб тэрарызме, саўдзельніка ваўкавыскага прадпрымальніка Мікалая Аўтуховіча, былога вайскоўца Уладзіміра Асіпенкі. Асіпенку падазравалі ў спробе замаху на тагачаснага кіраўніка Гродзенскага аблвыканкаму Уладзіміра Саўчанку. Замах нібыта рыхтаваў Мікалай Аўтуховіч, а Асіпенка быў ягонай правай рукой. Больш за год Асіпенка правеў у следчым ізалятары, пакуль ішло следства, якое па кожным пункту рассыпалася. У выніку суд прызнаў яго вінаватым у незаконных дзеяннях са зброяй — нібыта за захоўванне абрэза вінтоўкі — і асудзіў на тры гады калоніі. Да амністыі мінулай восенню Асіпенка паспеў адседзець некалькі месяцаў у Івацэвіцкай калоніі, але ўмоўнае пакаранне Асіпенкі скончылася 8 лютага.

«23 студзеня, упершыню за 2 гады, я ўсё ж з'ездзіў на рыбалку. З тым жа маім сябрам, з якім дамаўляўся ў дзень арышту. Такое задавальненне атрымаў. У 9 раніцы мы прыехалі на возера, а ў 14 гадзінаў ужо з'ехалі, і ў нас было 5 шчупакоў», — перадае словы Уладзіміра «Радыё Свабода». Уладзіміра здзівіла ўвага журналістаў да яго персоны. На яго думку, гэтай увагі найперш вартыя тыя, хто сядзіць зараз па справе 19 снежня.

8 лютага 2009 года ў Ваўкавыску па справе аб тэрарызме былі арыштаваныя Мікалай Аўтуховіч, Уладзімір Асіпенка і Юры Лявонаў. Аўтуховіч быў асуджаны на 5 гадоў за захоўванне пяці патронаў і адбывае пакаранне ў Івацэвіцкай калоніі. Юры Лявонаў у пачатку следства фігураваў як падазроны, праз паўгода падазрэнні былі знятыя, і прадпрымальніка вызвалілі з-пад варты. Зараз Юры Лявонаў працуе ў Маскве.

### АНТОН КУШНІР



Беларускі фрыстайліст Антон Кушнір стаў бронзавым прызёрам чэмпіянату свету па фрыстайле, які праходзіць у амерыканскім Дзір-Вэлі. Залаты медаль у акрабатыцы заваяваў канадзец Уорэн Шоўлдайс, срэбны — кітаец Цы Гуналю. Яшчэ адзін беларускі фрыстайліст Дзяніс Восіпаў заняў пятае месца, Максім Гусцік паказаў 11-ы вынік.

У жаночай акрабатыцы Ганна Гуськова заняла дзявятае месца, Ала Цупер не стартавала. Спаборніцтвы з-за траўм прапусцілі алімпійскі чэмпіён–2010 Аляксей Грышын і прызёр алімпіяд Зміцер Дашчынскі.

У 2010 годзе Антон Кушнір быў алімпійскім расчараваннем беларусаў — ён не патрапіў у фінал алімпійскіх спаборніцтваў па фрыстайле пасля няўдалага прызямлення ў другой спробе кваліфікацыі, хаця яму прарочылі высокі вынік. «Перад пачаткам кваліфікацыі вельмі хваляваўся. Спрабаваў сабрацца, каб не дапусціць правалу і выйсці ў фінал, — падзяліўся Кушнір сваёй радасцю з нагоды заваёвы бронзавай узнагароды на чэмпіянаце свету. — Вядома ж, я імкнуўся да перамогі, але трохі не хапіла. І ўсё такі я вельмі рады, што зарабіў для краіны медаль».

### ІВАН МЕЛЕЖ



8 лютага споўнілася 90 гадоў са дня нараджэння празаіка, паэта, публіцыста, драматурга, народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа (08.02.1921, вёска Глінішча Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці — 09.08.1976). Загадчыца аддзела беларускай літаратуры XX і XXI стагоддзяў Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі кандыдат філалагічных навук Алена Манкевіч адзначыла, што сярод іншых пісьменнікаў Мележа адрознівала задача, якую ён ставіў перад напісаннем сваіх твораў, — даць магчымасць героям самім сказаць пра сябе, выказаць сваю праўду. А ўжо як аўтар Мележ даследаваў чалавечыя лёсы ў складаны час.

Асноўным творам Мележа як празаіка з'яўляецца яго трылогія «Палеская хроніка», якая ўключае ў сябе раманы «Людзі на балоце», «Подых навальніцы» і «Завеі, снежань». Без герояў гэтай трылогіі, як гаварыў сам аўтар, ён не ўяўляў свайго жыцця. «І хоць Мележ не дапісаў трылогію так, як хацеў, але, як справядліва адзначыў літаратуразнаўца Дзмітры Бугаёў, і таго, што ўдалося сказаць пісьменніку пра палешукоў, досыць, каб яны назаўжды засталіся ў свядомасці беларусаў, пакуль мы будзем існаваць як народ», — цытуе БелаПАН Алену Манкевіч. На яе думку, яркай рысай творчасці Мележа з'яўляецца тое, што ён пражываў сам жыццё сваіх герояў. Пісьменнік Алесь Адамовіч у прадмове да збору твораў Івана Мележа зазначыў, што адну з падораных яму кніг Мележ падпісаў «Ад Васіля Дзятла», як бы атаясамляючы сябе са сваім героем.

▸ ПАРТЫІ

# Станіслаў Багданкевіч: «МНЕ СОРАМНА ЗА РАМАНЧУКА»

Вольга ХВОІН

**Партыя АГП правяла «чыстку» ў сваіх шэрагах. Нацыянальны камітэт Аб'яднанай грамадзянскай партыі выказаў вотум недаверу намесніку старшыні АГП Яраславу Раманчуку. Ад пасады старшыні камісіі АГП па міжнародных пытаннях вызвалены Андрэй Дзмітрыеў.**



Фота Юрыя Дзядзінкіна

Злева направа: Яраслаў Раманчук, Станіслаў Багданкевіч, Уладзімір Нісцюк на Усебеларускім сакіце прадпрымальнікаў, 21 верасня 2009 г. З архіва «НЧ»

На пасяджэнні Нацыянальнага камітэта АГП заслухалі былога кандыдата ў прэзідэнты ад АГП Яраслава Раманчука, які паўтарыў раней агучаную пазіцыю, што сваёй фактычна абвінаваўчай заявай 20 снежня на адрас калег па апазіцыйнаму лагеру «ратаваў жыцці іншых людзей».

Ганаровы старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі, былы кіраўнік Нацбанку Станіслаў Багданкевіч тлумачыць рашэнне партыі пра вотум недаверу тым, што, будучы кіраўніком АГП, Яраслаў Раманчук «паклёпніцкі адгукаўся пра сваіх калегаў, ён сведчыў супраць людзей, якія сядзелі ў КДБ, і нават прыплёў жанчыну, маці дзіцяці».

«Ён гэта здзейсніў, і ніякіх дадатковых звестак, каб адмежавацца ад падобнага кроку, не трэба, гэта называецца подласцю. Кандыдаты разам выступалі, гаварылі пра несправядлівасць рэжыму, заклікалі на плошчу. Гаварылі, што парушаецца Канстытуцыя, што ёсць манапалізацыя СМІ, што ёсць гарантыя доступу да СМІ партый паводле канстытуцыі, але гэта груба топчацца. Кандыдаты ў прэзідэнты заклікалі народ на мірную дэманстрацыю пратэсту, і ён потым заяўляе, што Ірына Халіп біла шкло ў Доме ўраду! Раманчук дзеля ўласнага ўратавання гатовы тапіць іншых, — са скрухай гаворыць Багданкевіч. — Мне на яго месцы было б сорамна, што я не сяджу з імі ў турме. Мы ж не адразу прагаласавалі аб недаверы, рэкамендавалі яму папрасіць прабачэння, прызнаць, што праявіў слабасць. Гаварылі: пакайцеся, падайце заяву пра сыход з пасады ў партыі. ... Ён гаворыць, што ратаваў некага ад смерці, але насамрэч тапіў гэтых людзей. Мне сорамна за Раманчука».

Суб'ект скандалу — Яраслаў Раманчук — апелюе да факту, што рашэнне Нацыянальнага камітэта АГП усяго толькі канстатуе недавер да пэўных яго дзеянняў. З пасады намесніка старшыні партыі Яраслава не знялі, бо гэта ў паўнамоцтвах з'езду партыі. На пытанне, чаму ён не пакаяўся, як яму раілі аднапартыйцы, Раманчук сказаў: «Маё слова можа азначаць вялікія праблемы для тых, хто знаходзіцца ў турме. Я паважаю меркаванне калег, але гэта маё ўласнае рашэнне».

Новым старшынёй камісіі па міжнародных пытаннях замест Андрэя Дзмітрыева абраны Юрый Лаўрэнцьеў.

Палітолаг Андрэй Ляховіч спачатку адмовіўся каментаваць «разбор палётаў» АГП, спаслаўшыся на той, што гэта «ўнутраная справа партыі», але дадаў: «Калі кіраўніцтва партыі лічыць, што чалавек паводзіць сябе не адпаведна лініі партыі, то, натуральна, ёсць падставы пазбавіць такога чалавека ў пасадзе». Гэта тычыцца і Андрэя Дзмітрыева, які працаваў на кандыдата ад іншых палітычных сілаў, бо «ён парушыў унутраны парадак партыі».

Андрэй Ляховіч зазначае, што тым, хто праводзіць палітычныя кампаніі, трэба распачынаць наступную адразу ж пасля абвяшчэння вынікаў галасавання. «Трэба асэнсаваць памылкі, перш за ўсё тое, што апазіцыя падышла да выбараў у вельмі раз'яднаным стане, людзям было цяжка вызначыцца з выбарам апазіцыйнага кандыдата. Я, на жаль, не бачу працы над памылкамі, зруху па пераадоленню раз'яднанасці, не бачу працы з выбарцамі ў стане апазіцыі. Нашы палітыкі зноў займаюцца тым, што лічаць істотным яны, а не грамадзяне Беларусі. Важна, каб была пераадоленая раз'яднанасць, бо без гэтага нічога добрага не будзе, да новых выбараў апазіцыя зноў прыйдзе са старымі памылкамі», — падкрэсліў палітолаг.

▸ САЦЫЯЛОГІЯ

# СТРАХ — НЕ ПРЫЧЫНА ПАРАЗЫ

Вольга ХВОІН

**Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД) зрабіў аналіз паствыбарчых настрояў у беларускім грамадстве. Вынікі апытання сведчаць, што беларускае грамадства застаецца не гатовым да пераканаўчай падтрымкі альтэрнатыўнага Лукашэнку палітыка. Апазіцыя дагэтуль не дайшла да разумення, на чым трымаецца падтрымка Лукашэнкі, і свае няўдачы спісвае на «фактар страху» і недасканаласць сацыялогіі.**

## Плацэба «меншасці»

Беларускае грамадства раскалатае на «большасць» і «меншасць», гэта з нядаўніх часоў перастала быць сакрэтам нават для чатырохразова «ўсенароднаабранага», — гавораць эксперты НІСЭПД. «Большасць» верыць у правільнасць курсу, якім краіна ўжо сямнаццаты год рухаецца, у справядлівы падзел галасоў, у радыкальнае паляпшэнне ўмоў жыцця вяскоўцаў за кошт будаўніцтва аграгарадкоў і г. д. Што тычыцца «меншасці», то яна верыць у тое, што «меншасцю» не з'яўляецца.

Фактар страху — гэта своеасаблівае плацэба «меншасці». Не турбуючы сябе разважаннямі, «меншасць» тлумачыць фактарам страху любы вынік апытанняў, які яго не задавальняе. Логіка тут простая — ва ўмовах апошняй еўрапейскай дыктатуры рэспандэнты баяцца выказваць свае праўдзівыя палітычныя прыхільнасці.

Сацыёлагі з гэтым не згодныя і прыводзяць прыклады пытанняў, якія перакрыжоўваюцца паміж сабой і гавораць пра слушнасць вынікаў даследаванняў.

Аналіз вынікаў галасавання ў 2006 годзе паказаў, што прыкладна 40% тых, што не захацелі адказваць на пытанне, за каго яны галасавалі на выбарах прэзідэнта, складаюць прыхільнікі Лукашэнкі, а звыш траціны — прыхільнікі альтэрнатыўных кандыдатаў.

| ЦІ СТАЎ ПРЭЗІДЭНТАМ ТОЙ КАНДЫДАТ, ЗА ЯКОГА ВЫ ПРАГАЛАСАВАЛІ? | | | |
|---|---|---|---|
| **Варыянт адказу** | **10'01** | **04'06** | **12'10** |
| Так | 50,4 | 61,4 | 49,6 |
| Не | 35,4 | 30,5 | 32,8 |
| НА | 14,2 | 8,1 | 17,6 |

| ДЫНАМІКА АДКАЗАЎ НА ПЫТАННЕ: «ЯК ВЫ ДУМАЕЦЕ, ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ, АБВЕШЧАНЫЯ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІЯЙ, З'ЯЎЛЯЮЦЦА САПРАЎДНЫМІ ВЫНІКАМІ ВЫБАРАЎ АБО СФАЛЬСІФІКАВАНЫМІ?» ( %) | | |
|---|---|---|
| **Варыянт адказу** | **04'06** | **12'10** |
| Адназначна сапраўднымі | 38,1 | 32,7 |
| Хутчэй сапраўднымі | 25,6 | 29,9 |
| Хутчэй сфальсіфікаванымі | 14,1 | 16,2 |
| Адназначна сфальсіфікаванымі | 14,9 | 13,2 |
| НА | 7,3 | 8,0 |

Падкрэсліваецца і той факт, што на працягу 2010 года апытанні не давалі падставаў «для апазіцыйнага аптымізму». Усе сацыяльныя індэксы павольна, але няўхільна ўзрасталі, адгукаючыся на перадвыбарныя сацыяльныя выплаты. Іх выніковыя значэнні апынуліся паміж значэннямі 2001-га і 2006 гадоў. Такімі сталіся і вынікі галасавання.

Электаральная падтрымка Лукашэнкі вызначаецца яго здольнасцю забяспечваць рост матэрыяльнага дабрабыту насельніцтва за чужы кошт. Выбары 2006 года прыйшліся на пік расійскіх датацый. Чацвёрты прэзідэнцкі тэрмін аплацілі знешнія крэдыторы. Свой істотны ўнёсак у захаванне дыктатуры ў цэнтры Еўропы зрабіў Міжнародны валютны фонд — рэзюмуюць сацыёлагі.

## «Меншасць» большая, чым мяркуе Лукашэнка

Сацыёлагі прыводзяць дадзеныя апытання, якія «дазваляюць ацаніць ступень крытычнасці грамадскай думкі з нагоды апошніх прэзідэнцкіх выбараў». Грамадская думка раскалолася на стандартныя для Беларусі «большасць» і «меншасць», праўда, не ў той прапорцыі, як вымушаны быў прызнаць Лукашэнка на прэс-канферэнцыі 20 снежня. Доля «меншасці» складае не 20%, а каля 30%. На пытанне «Як Вы мяркуеце, ці былі выбары прэзідэнта Беларусі свабоднымі і справядлівымі?» у снежні мінулага года станоўча адказалі 54,4% рэспандэнтаў. Не вераць у справядлівасць выбараў 32,3% апытаных.

Скептычнае стаўленне трацін беларусаў да свабоды і справядлівасці выбараў не ў апошнюю чаргу звязанае з недаверам да дзейнасці ЦВК. Дарэчы, лібералізацыя ўзроўню даверу не падвысіла.

Ключавым элементам легітымнасці любой улады з'яўляецца давер, які аказвае ёй насельніцтва. Давер, у сваю чаргу, можа генеравацца як масавымі чаканнямі паляпшэння дабрабыту за кошт сацыяльна-эканамічнай палітыкі, так і законнасцю выбарчых працэдур. Гэтыя фактары з'яўляюцца ўзаемадапаўняльнымі, толькі разумны кампраміс паміж імі здольны забяспечыць стабільнасць.

Ва ўмовах імітацыйнай дэмакратыі дадзены кампраміс недасягальны, і таму беларуская ўлада змушаная рабіць упор на куплю галасоў, не грэбуючы пры гэтым і сілавым кампанентам, — рэзюмуюць сацыёлагі. Тут варта было б прыгадаць словы прэзідэнта Літвы і «прыяцелькі» Лукашэнкі спадарыні Грыбаўскайтэ, якая нядаўна падкрэсліла, што «народ сам павінен вырашыць, якую ўладу ён хоча мець».

▸ МЕРКАВАННЕ

## АПЕРАВАЦЬ САЦЫЯЛАГІЧНЫМІ АПЫТАННЯМІ ТРЭБА АСЦЯРОЖНА

— Прапанаваць адназначны варыянт змены стратэгіі дзеянняў беларускай апазіцыі складна, бо ёсць розныя групы людзей, розныя інтарэсы, — лічыць **палітолаг Андрэй Казакевіч**. — Нешта раіць складана і з прычыны таго, што волевыяўленне электарату мала на што ўплывае. Ёсць шматгадовая практыка фальсіфікацыі выбараў, мы не ведаем рэальных лічбаў таго, колькі людзей прагаласавалі за Лукашэнку, колькі за альтэрнатыўных кандыдатаў. Аперавацъ сацыялагічнымі апытаннямі, якія нічым не верыфікуюцца, таксама трэба асцярожна.

Апазіцыі варта найперш вызначыць рэалістычныя мэты, што тычацца палітычных кампаній ці свайго змагання ў бліжэйшай перспектыве. Цяжка будзе ставіць мэту паводле прынцыпу «электаральнай перамогі». Мэта мусіць быць больш рэалістычнай, і дзейнасць павінна будавацца ў яе рэчышчы. Напрыклад, праца з насельніцтвам, палітычнымі сіламі Еўропы, Расіі.

Апытанні НІСЭПД паказваюць, што ёсць ад 25% да 35% апазіцыйнага электарату. Тыя ж, хто падтрымлівае Лукашэнку (50–60%), — устойлівая структура. Як гэта зламаць — сказаць цяжка. Патрэбны не проста паспяховыя дзеянні апазіцыі, але і пэўны збег абставінаў. Бо ёсць такі фактар, калі людзі стабільна галасуюць за чалавека ва ўладзе. Рацыянальна галасуе толькі частка электарату Лукашэнкі.

ГАСПАДАРЧАСЦЬ

# АДМОЎНАЯ ДАДАДЗЕНАЯ ВАРТАСЦЬ

Канстацін СКУРАТОВІЧ

**Сельская гаспадарка мела на мінулы год прагнознае заданне падвысіць памер валавой вытворчасці на 10–11%. Атрымалася толькі на 2%.**

Ні адна з абласцей не дасягнула запланаванага, а ў Гомельскай вобласці памер вытворчасці склаў толькі 96,8% ад узроўню 2009 года. Гэта ўсё афіцыйныя дадзеныя аб стане спраў ва ўсіх гаспадарках — рэфармаваных калгасах, фермерскіх, прысядзібных і садова-агародных. Што тычыцца арганізаванага сектара вытворчасці, то, мусіць, афіцыйная статыстыка ёсць адзінай крыніцай праўдападобнай інфармацыі.

А колькі агрэсту ды парэчак нарыхтавана на лецішчах, колькі зварана варэння ды закатана слоікаў з агуркамі з уласных агародаў, гэта, верагодна, ёсць вялікай таямніцай. Таму там памеры вытворчасці вызначаюць, зыходзячы з колькасці «сотак» ды ўчасткаў. Можа, на іх ужо нічога не расце, акрамя лебяды ды свірэпы, але ж па дакументах расці павінна. Вось і плюсуюць адзін да аднаго ўмоўныя ўраджаі з умоўных кустоў.

Атрымліваецца, што збор год ад года расце. Больш дакладная інфармацыя (бо яна праходзіць па бухгалтарскіх кнігах) існуе наконт прыватнай жывёлагадоўлі. Яна сведчыць, што ў вёсцы ўзнікае прынцыпова новая сацыяльная сітуацыя. Сельскія жыхары ўсё больш прыкідваюць на сябе статус «дачнікаў», зводзяць скаціну са двара. У мінулым годзе закупкі буйной рагатай жывёлы ў насельніцтва зменшыліся на 5%. Прычым у Віцебскай вобласці, бо закупляць ужо няма чаго. Зараз надышла чарга самых «сялянскіх» абласцей. У Гродзенскай вобласці — мінус 17,5%, Гомельскай — мінус 7,3%, Брэсцкай — мінус 6,1%.

Закупкі малака ў насельніцтва зменшыліся на 15,5%.

Велічныя планы па падвышэнню вытворчасці ўжо цалкам ляглі на плечы былых саўгасаў ды калгасаў. Прыватнік ад гэтай пачэснай місіі адмовіўся.

З эканамічнага боку гэта азначае страту каля 1/3 аб'ёму вытворчасці, якая амаль не патрабавала дзяржаўных рэсурсаў. Адпаведна, у калгасы і саўгасы для захавання і падвышэння гэтых аб'ёмаў, трэба накіраваць дастатковыя сродкі. Яны і сёння не малыя. Да таго ж, выкарыстоўваюцца не вельмі эфектыўна. І здаецца, што ў дадзеных палітычных і гаспадарчых умовах, больш эфектыўна выкарыстоўваць іх не могуць. Прыкладам, у 2008 годзе ў галіну было накіравана 4,6 трыльёна рублёў, што ў пераліку на 1 гектар сельгасугоддзяў склала 212 долараў, або 130% ад паказчыка пагектарнага субсідавання 2007 года.



Вытворчасць прадукцыі павялічылася ўсяго на 4%, праз год — на 1,3%, у 2010 годзе, як адзначалася вышэй, — на 2%.

Калі ўзяць пад увагу асаблівасці ўліку памераў вытворчасці ў прыватным сектары, то пры такіх лічбах мае сэнс гаварыць пра статыстычную прыроду афіцыйных паказчыкаў. Мабыць, дзесьці памыліліся, дзесьці прыпісалі, каб зрабіць уражанне рэальнага падвышэння на фоне двухзначных лічбаў планавага задання.

Па дадзеных Белстата, у 2007 года аб'ем валавой прадукцыі ва ўсіх катэгорыях гаспадарак дасягнуў 98,9% ад узроўню 1990-га. Але ў калгасаў і фермераў — толькі 88,4%. Такім чынам, галіна здзейсніла мару Лукашэнкі аб рэканструкцыі валавых паказчыкаў 1990 года амаль выключна намаганнямі ўласнікаў, якія паднялі вытворчасць да 138,6% ад узроўню апошняга поўнага савецкага сельскагаспадарчага года.

Вось для каго трэба было штогод ладзіць Дажынкі ды выдаваць субсідыі. Але, як той казаў, прыватнік «был взвешен на весах и признан очень легким». Таму амаль усе рэсурсы былі скіраваны ў «буйнатаварныя гаспадаркі». Калі іх ацэньваць менавіта з пункту гледжання таварнасці, то акажацца, што яны і не «буйныя», і нават «не таварныя». Бо вынікам іх працы з'яўляецца адмоўная дабаўленая вартасць. Гэта добра відаць па лічбах. За мінулы год валавая прадукцыя павялічылася на 2%, а пратэрмінаваная крэдытная запазычанасць гаспадарак у параўнанні з 1 снежня 2009 года павысілася на 19% і склала 2,2 трыльёна рублёў.

На долю галіны выпала 32,8% усёй пратэрмінаванай крэдыторскай запазычанасці на краіне, хоць яе доля ў вытворчасці ВУП не дасягае 10%.

Аграрнікі звыш тэрміну завінаваціліся за паліўна-энергетычныя рэсурсы (65,8 мільярда рублёў — плюс 6,8%), па падатках і зборах, сацыяльнаму страхаванню — 61,2 мільярды, па крэдытах і займах — 510,6 мільярда (у 1,5 разы больш, чым год таму).

Падкрэслім, што гэта толькі пратэрмінаваная запазычанасць, даўгі, па якіх трэба было ўжо разлічыцца. А ўся крэдыторская запазычанасць за амаль што поўны гаспадарчы год — 12,3 трыльёна рублёў.

Трэба таксама ўлічваць і адмоўную вартасць, створаную сельгаспрадпрыемствамі ў мінулыя гады, падчас ажыццяўлення праграмы адраджэння вёскі. На нарадзе па выніках 2009 года тагачасны міністр сельскай гаспадаркі Сямён Шапіра распавёў, што сума агульных фінансавых абавязацельстваў сельгасарганізацый склала 34 трыльёнаў рублёў. Ужо ў 2008 годзе сума агульных абавязацельстваў пераўзышла вартасць выробленай імі валавой прадукцыі, праз год — перавысіла вартасны аб'ём вытворчасці ў 1,26 разы.

Гэта азначае, што для атрымання прадукцыі на 1 рубель калгасам трэба «закапаць у зямлю» (можна нават і без двукосся) рэсурсаў на 1 рубель і 26 капеек. Як паказваюць вынікі, за мінулы год гэтыя суадносіны змяніліся да горшага.

Сёння перад галіной ставяцца новыя «более амбициозные задачи». І ніхто не ўспамінае аб былых, зруйнаваных жыццём, амбіцыях. А велічыня ствараемай адмоўнай вартасці з кожным годам павялічваецца.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# «ДАЧКУ ПУБЛІЧНА ЗГАНЬБІЛІ ДА СУДА»

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Ужо больш як пяць месяцаў зняволеная СІЗА–3 не можа «трапіць на прыём да доктара». Яе бацька, жыхар Гомеля, Аляксандр Працка даслаў у рэдакцыю ліст з просьбай пра дапамогу. Ён заяўляе, што справу аб прастытуцыі супраць дачкі Галіны сфабрыкавалі.**

## Гніды штодзень

У Галіны звужаюцца сасуды на нагах, ад гэтага чарнеюць пальцы. «Ёй неабходна медычная дапамога, бо лекі, якія я нашу для перадачы, не дапамагаюць. У дадатак да гэтага яшчэ і вошы напалі, як не бераглася...» — піша ў лісце Аляксандр Працка.

«Я абураная наконт працы тут медсанчасці і ўжо пісала наконт гэтага скаргу начальніку СІЗА, — напісала Галіна бацькам. — Буду чакаць адказу. Майму ж цярпенню прыйшоў канец — дажыцца да такога, што па іх віне палова камеры заразілася вошамі! Але зараз я ўжо два разы карысталася лекамі — шампунем «Хігія», і штодзень даводзіцца даставаць гніды з галавы!» Паразіты распаўсюджваюцца, як патлумачыла Галіна, з-за бамжых, якіх «закідваюць без нармальнай санапрацоўкі».

«І яшчэ — ніякіх вітамінаў я дагэтуль не атрымала, а сёння ўжо 18 студзеня, я нават не ведала, што тата перадаў перадачу ў мінулы чацвер — а даведалася з вашага ліста сёння», — напісала Галіна Працка.

## Спецаперацыя з удзелам БТ

26-гадовая Галіна была затрымана ў жніўні 2010 года гомельскімі супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю. Яна накіроўвалася на сваёй машыне з дзвюма дзяўчынамі ў Кіеў, каб адтуль ляцець у Турцыю, дзе яе сястра збіралася пабрацца шлюбам з туркам. А спадарожніцы Галіны збіраліся на адпачынак, у іх былі пуцёўкі. Галіну абвінавацілі ў вывазе жанчын за мяжу «для сістэматычнага займання прастытуцыяй». Спецаперацыя па затрыманні Галіны адбывалася з удзелам БТ.

«Яна стала сімвалам Беларусі па вывазе дзевак за мяжу. І ў адзін дзень стала прастытуткай №1 краіны. Беспадстаўна зганьбілі публічна, заўчасна, да суда», — кажа Аляксандр Працка. Дагэтуль Галіна выдатна скончыла каледж у Гомелі, платна навучалася ў Мінскім педінстытуце. Больш за тры гады працавала з дзецьмі дашкольнага ўзросту.

Аляксандр Працка лічыць, што гэта палітычная расправа над яго сям'ёй. Бацька і дачка з'яўляюцца сябрамі Аб'яднанай грамадзянскай партыі. У 2006 годзе ён і яго дзве дачкі, адна з якіх жыве зараз з мужам у Турцыі, прымалі ўдзел у прэзідэнцкай кампаніі і агітавалі за Мілінкевіча. Малодшую дачку Алену ў тым жа годзе адлічылі з універсітэта з фармулёўкай «за непаспяховасць». Як кажа бацька, Галіна збіралася браць удзел і ў гэтай прэзідэнцкай кампаніі. А ў дзень затрымання адзін з супрацоўнікаў органаў, які вёў допыт, «пацікавіўся»: «Што гэта твой бацька супраць Лукашэнкі?»

## Паслугі без кліентаў

Аляксандр Працка паведамляе і пра іншыя акалічнасці справы. Пра допыты дачкі без адваката, пра адмовы бацькам сустрэцца з Галінай, пагрозы 10 гадоў турмы. «Няма кліентаў ці прозвішчаў тых, хто атрымаў сексуальныя паслугі. Няма грашовых разлікаў з фактычным іх атрыманнем», — падкрэслівае ён. Скаргі ў розныя пракурорскія інстанцыі з просьбай правесці праверку справы аказаліся безвыніковымі.

Добрушскі раённы суд разглядае справу за зачыненымі дзвярыма. Суддзя А. Васюкоў не задаволіў хадайніцтва, каб бацька быў прадстаўніком Галіны.

Адвакат Сяргей Красноў паведаміў журналістам, што адна з «ахвяраў» Крысціна, якая ехала ў Турцыю з Галінай, усе размовы запісвала на дыктафон. Як відавочна, Крысціна задавала «прадыктаваныя» міліцыяй пытанні. Напрыклад, неаднаразова запытвала ў Галіны, колькі каштуе вывезці дзяўчыну ў Турцыю для займання прастытуцыяй. Паводле словаў адваката, большая частка доказных матэрыялаў у справе — дыктафонныя запісы дзявочых размоваў, жартаўлівых і несур'ёзных.

Як лічыць Аляксандр Працка, улады дэманструюць змаганне ў справе з гандлем людзьмі, бо краіны Еўрасаюза выдзяляюць беларускім уладам фінансавую дапамогу для барацьбы з сексуальным нявольніцтвам. «Робіцца выгляд, што вядзецца праца па гэтай барацьбе, — мяркуе Аляксандр Працка. — Адпрацоўваючы грант Еўрасаюза на барацьбу з трафікам, гомельскія сышчыкі працягваюць рабіць «гучныя справы» і ствараць бачнасць сваёй працы. Вырашылі заадно наехаць і на апанентаў сённяшняга рэжыму і іх сем'і».

## Падаплёка

«І па словах адваката, і тых людзей, якія так ці інакш з гэтай справай звязаныя, справа шытая белымі ніткамі. То бок яна сфабрыкаваная», — адзначыў старшыня Гомельскай абласной арганізацыі АГП Васіль Палякоў.

Супраць Галіны сведчаць дзве яе спадарожніцы. «Усё будуецца літаральна на іх паказаннях і на нейкіх там запісах, сапраўднасць якіх немагчыма ўстанавіць. Хаця і па тых запісах, наколькі мне вядома, зноў жа немагчыма даказаць віну», — паведаміў Васіль Палякоў.

Паводле яго словаў, большасць дасведчаных у гэтай справе людзей звязваюць яе з пэўнымі праграмамі падтрымкі Беларусі з боку еўрапейскіх краін. У канкрэтным выпадку — гэта барацьба з гандлем жанчынамі і вывазам іх за мяжу.

«І вось пад гэту барацьбу і пад гэты праект фабрыкуюць такія справы, — пракаментаваў сітуацыю Васіль Палякоў. — І да нас ужо звярталіся ў Гомелі людзі, якія былі асуджаныя па гэтых артыкулах, якіх банальна падставілі. А дзяўчыны, якія па розных справах праходзілі сведкамі, нават пашпарты мянялі. Адны і тыя ж сведкі, але ідуць пад рознымі прозвішчамі па розных пашпартах. Быццам бы іх схілялі да выезду за мяжу для займання прастытуцыяй. Гэта справа з такой жа катэгорыі. З дыктафонам прыходзяць на сустрэчы і размовы па тэлефоне запісваюцца. Гэта проста так не адбываецца. І таму, вядома, палітычная падаплёка прысутнічае. У першую чаргу, як я бачу сітуацыю, не столькі, каб пакараць Процку ці яго дачку за актыўную палітычную дзейнасць. Колькі паказаць, як у Беларусі змагаюцца з такім злом, як гандаль жанчынамі».

ЭКАЛОГІЯ

# ЗВАРОТНЫ БОК «САЛЁНАЙ» ВАЛЮТЫ

Вольга ХВОІН

**Ваколіцы Салігорска з пэўных ракурсаў нагадваюць горныя краявіды. Солеадвалы ААТ «Беларуськалій» напраўду экзотыка на раўнінным рэльефе краіны. Лідар расійскага рок-гурта «Кіпелаў», для якога кліп на адну з песень здымалі якраз на гарах адходаў прадпрыемства, гаварыў: «Мы абалдзелі, калі пабачылі гэты пейзаж. Мы думалі, што толькі на Месяцы можа быць такое. Там абсалютна незямная атмасфера. Самае цікавае, што ўсё натуральнае, ніякай кампутарнай графікі не давялося рабіць». Мясцовым жыхарам незямны пейзаж нясе не толькі эстэтыку, але і праблемы. Піць ваду са студняў у населеных пунктах вакол гор «Беларуськалію» санітарны кантроль перыядычна забараняе, дамы трэскаюцца, зямля над выпрацаванай пародай прасядае. Па «засоленых» вёсках Салігоршчыны мы праехалі падчас экалагічнага прэс-туру Беларускай асацыяцыі журналістаў.**



Фота аўтара

### Даведка

У жніўні 2010 года рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Беларуськалій» — адзін з буйнейшых у свеце і самы буйны ў СНД вытворца і пастаўшчык калійных мінеральных угнаенняў, адно з вядучых прадпрыемстваў-экспарцёраў краіны — было ператворана ў ААТ, 100% акцый якога належаць дзяржаве. Увесь пакет акцый ААТ «Беларуськалій» ацэнены ў 30 мільярдаў долараў ЗША. Кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў гатоўнасць прадаць да 25 працэнтаў акцый вытворцы калійных угнаенняў. За 25-працэнтную долю Беларусь плануе атрымаць 6–7 мільярдаў. «Беларуськалій» выпускае кожную шостую тону калійных угнаенняў у свеце. Сумесна з ААТ «Уралкалій» з'яўляецца заснавальнікам ЗАТ «Беларуская калійная кампанія» — аднаго з буйнейшых пастаўшчыкоў калійных угнаенняў.



Шламасховішча

У раёнах солеадвалаў і шламасховішчаў з Салігорскага калійнага камбіната на плошчы 15 квадратных кіламетраў сфармавалася зона хларыдна-натрыевага засалення, якая ахоплівае падземныя воды да глыбіні больш за 100 метраў. Мінералізацыя забруджаных водаў дасягае 160 грамаў на літр. Мае месца тэндэнцыя пашырэння арэала забруджвання, хуткасць якога складае да 50–85 метраў на год.

## Піць са студняў нельга

Цяпер на ААТ «Беларуськалій» працуе каля 18 200 чалавек. Прадпрыемства складаецца з чатырох узбагачальных фабрык і пяці руднікоў, будуецца шосты, ідуць размовы наконт будаўніцтва сёмага рудніка. Традыцыйна мяркуецца, што шахцёры — адны з найбольш забяспечаных людзей, але за свой матэрыяльны дабрабыт яны расплачваюцца здароўем. Анкалогія, прафесійныя захворванні, і ў выніку сярэдняя працягласць жыцця шахцёра — 49 гадоў. Мужчыны праблемы са здароўем маюць часцей. Да слова, грунтоўных даследаванняў наконт таго, як спецыфічная экалогія Салігоршчыны ўплывае на здароўе людзей, не праводзілася. Таму аперавацьканкрэтнымі лічбамі не атрымліваецца.

Вакол руднікоў і солеадвалаў месціцца з дзясятак вёсак. У 1990-я гады іх жыхарам прапаноўвалі адсяліцца, давалі кватэры ці ў Салігорску, ці ў аддаленых населеных пунктах. Нехта пагаджаўся і з'язджаў, нехта заставаўся ці пакідаў дом пад лецішча. Цяпер многія з гэтых вёсак маюць з дзясятак жыхароў, што дажываюць век на роднай зямлі. Большасць мясцовых не бачыць катастрофы ад суседства з солеадваламі, хаця праз пару гадзінаў паездкі па ваколіцах на вуснах застаецца прысмак солі.

У вёсцы Бранчыцы ў 1970-х, як сцвярджаюць яе жыхары, было каля тысячы двароў. Цяпер вёска ў стане вымірання. Некалькі адзінокіх бабулек, дачнікаў і напаўразваленыя дамы. Атмасфера вёскі нагадвае чарнобыльскую зону — тое ж запусценне і адчуванне тла. Аляксандр Гурыновіч — мужчына гадоў сарака, супрацоўнік «Беларуськалію», — у вёску прыязджае да цесця. Кажа, што дом яшчэ добры і можна было б жыць. Асаблівых нараканняў на блізкасць руднікоў і солеадвалаў няма. «Лопнулі кольцы студні ад прасадкі зямлі, дык давялося закапаць. А так усё збольшага нармальна. Вада тут добрая, ёсць невялікае перавышэнне па жалезу, але гэта характэрна для ўсёй Беларусі», — рэзюмуе часты госць Бранчыц.

У доме насупраць жыве ўраджэнка вёскі, пажылая ВалянцінаВаўчок. Расказвае, што кожны год прыязджае інспекцыя, правярае ваду і вешае таблічкі, што піць са студняў нельга. Мясцовыя тыя таблічкі здымаюць. «Мы прывыклі, вада, здаецца, нармальная па смаку. Але калі што малочнае варыш, вадой зальеш, то малако збягае», — наракае жанчына. Яна расказвае, што на гародах зямля час ад часу становіцца чырвонай, але на ўраджай тое не ўплывае.

Эколаг Яўген Лабанаў гаворыць, што калі ў пэўным месцы назіраецца канцэнтрацыя нейкага рэчыва, то, натуральна, яно будзе ў грунтовых водах, глебе, з адкрытых сховішчаў ветрам разносіцца на адлегласці. «Калі ёсць перавышэнне дапушчальных канцэнтрацый рэчываў, то мусіць быць санітарная зона з абмежаваннем сельскагаспадарчай дзейнасці, пражывання людзей. Як і любы аб'ект горназдабываючай прамысловасці, «Беларуськалій» дае вялікі аб'ём адходаў, па маёй інфармацыі, гаварыць аб прамысловым, эканамічна мэтазгодным іх выкарыстанні падстаў няма. Інакш гэта было б ужо рэалізавана», — разважае эколаг.

## Горы, якія мяняюцца

Саляныя горы даволі высокія — ад 150 да 200 метраў, штогод солеадвалы ўсаджваюцца прыкладна на пяць метраў, але і папаўняюцца яны перапрацаванай рудой таксама рэгулярна. Салігорскія горы мяняюць свой колер пад уздзеяннем надвор'я, тэмпературы паветра, дажджу. Солеадвалы цяпер займаюць плошчу прыкладна ў 600 гектараў. Побач знаходзяцца шламасховішчы — невялікія саджалкі з салёнай вадой, у іх утрымліваецца за 70 мільёнаў тон адпрацаванага расолу. Табліца Мендзялеева вакол нас — так гавораць мясцовыя жыхары.

Чапялі на фоне бліжэйшых вёсак — буйны населены пункт. Тут жыве больш за трыста чалавек. А за агародамі бачныя солеадвалы, трубы ўзбагачальнай фабрыкі. З-за надвор'я вуліцы пустынныя, на брэх сабакі з аднаго з дамоў выходзіць маладая сімпатычная жанчына. Марына кажа, што пераехала ў Чапялі з іншай вёскі, што спачатку было непрывычна, а потым прызвычаіліся. «Тут прыгожа, гэтыя горы кожны дзень розныя. Мы не скардзімся», — разважліва гаворыць жанчына. Яна мяркуе, што солі спрыяюць агародніцтву — капуста расце сакавітай, ураджаі гародніны някепскія. Пасля размовы застаецца шмат пытанняў, як, напрыклад, што змусіла гэту разумную жанчыну прыехаць жыць у вёску па суседству з адыходамі прамысловасці.

Гандлярка мясцовай крамы Ларыса Карніевіч штодня ездзіць на працу з Салігорска больш за дзесяць гадоў — хутка пенсія, таму трэба дапрацаваць. Яна расказвае, што крама, як і некаторыя дамы, прасела ды змацаваная металічнымі канструкцыямі. Жанчына гаворыць, што сама п'е толькі мінеральную ці пітную бутыляваную ваду, прыезджыя таксама набываюць, а тутэйшыя спажываюць сваю. Цікава, што ёсць ахвочыя да мясцовай нерухомасці, і дамы тут прадаюць за пяць-сем тысяч долараў.

Вёска Глядкі ад саляных адвалаў крыху далей, але і тут сцены дамоў сцягнутыя жалезнымі канструкцыямі. Гэтую паслугу аказваюць за кошт «Беларуськалія». Трэснула сцяна — гаспадары выклікаюць камісію, і калі прычына ў прасадцы глебы, то рамонт і ўмацаванне сценаў будзе за кошт вытворцы ўгнаенняў. Многія хаты пафарбаваныя ў радасныя колеры, больш дагледжаныя. Праз вёску праходзіць чыгунка, на адной вуліцы нават будуецца вялікі дом са шклопакетамі, сучаснай атынкоўкай. Дарэчы, адсюль жыхароў ніхто не адсяляў і кватэры ў Салігорску ім не давалі.

Для жыхароў гэтых вёсак, асабліва маладых, больш злабадзённай праблемай ёсць працаўладкаванне, інфраструктура, а не наяўнасць саляных адвалаў і азёр. Прыезджых могуць бянтэжыць канавы на палетках, што збіраюць ваду, каб яна не застойвалася з-за правалаў зямлі, чырвоныя разводы на глебе і ў лужынах. Тым, хто тут жыве, гэта звычайна і прывычна.



Аляксандр Гурыновіч



Дом са сцяжкамі ад разбурэння

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 16 ЛЮТАГА, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.55, 18.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 01.40** Зона Х.
**07.30, 11.55** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50, 17.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**11.40** Відэафільм АТН «Шчучынскі апокрыф» цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Меладрама «Зусім іншае жыццё» (Украіна). 1-я серыя.
**14.05** Праграма «Акно ў Еўропу».
**14.25** Альманах вандраванняў.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** «OFF STAGE LIFE».
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў».
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**20.00** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Арсенал»-»Барселона». Прамая трансляцыя.
**23.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Рома»-»Шахцёр».
**01.50** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Доктар Тырса». Шматсер. фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Залаты капкан». Шматсерыйны фільм.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** Асяроддзе пасялення.
**00.35** «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Халасцякі». Серыял.
**15.30** «Мёртвы, жывы, небяспечны». Серыял. Заключная серыя.
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажаліцца».
**22.55** «Хірамант». Серыял.
**23.50** «Пантэра». Серыял.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ».
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35, 16.45** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.35** «Жэня, Женечка і «кацюша». Фільм.
**12.05** Спорт-кадр.
**12.35** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**13.20** Медычныя таямніцы.
**13.50** Камедыйны серыял «Прыгоды салдата Івана Чонкіна» (Расія). 3-я серыя.
**14.45** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.40** Пазакласная гадзіна.
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**17.50** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - Трактар (Чэлябінск). Прамая трансляцыя. У перапынку: «Калыханка».
**21.15** Тэлебарометр.
**21.20** Беларуская часіна.
**22.20** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**23.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.30** Рэальны свет.
**00.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «2012. Ці спраўдзяцца вяшчунствы майя? Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Капітан Гардзееў».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Рускі шакалад». Тэлесерыял.
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Цуд».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Капітан Гардзееў».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.45** «Гістарычныя хронікі».

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Дачныя адказ».
**11.20** «Развод па-руску».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Серыял «Ментоўскія войны».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Пагоня за ценем».
**21.30** Прэм'ера. Баявік «Святаяннік».
**23.40** Крымінальны баявік «Зграя».

**09.30** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**09.45** Вось дык так!!!
**10.00, 14.00** Тэніс. Турнір WTA у ААЭ (Дубай). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**11.45, 13.00** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Камандныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**15.45, 21.45** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ньюпарт, Вялікабрытанія). Дзень 3-і. Прамая трансляцыя.
**19.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Агляд.
**19.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.55** «Спартовае вандраванне». Горныя лыжы. Часопіс.
**20.00** Абранае па серадах.
**20.05** Навіны коннага спорту.
**20.10** Гольф. ТУР PGA (Пебл-Біч, ЗША).
**21.05** Гольф-клуб.
**21.10** Ветразевы спорт. Рэгата Rolex (Сіднэй, Аўстралія).
**21.40** Яхт-клуб.
**00.00** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Камандныя спаборніцтвы.
**01.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ньюпарт, Вялікабрытанія). Дзень 3-і.

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30, 12.05** Праект «Будучыня».
**07.55, 12.30** Рэпартэр.
**08.20, 12.55** Асабісты капітал.
**08.35** «Паэма веры», дак. фільм, Беларусь.
**09.05, 13.35** Хто ёсць кім?: «Антон Астаповіч: Каб ведалі адкуль наш род!», дак. фільм, Польшча.
**09.20** «Мой родны горад», серыял.
**09.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Васіль Цяпінскі».
**10.00** «Зграя», сенсацыйны серыял.
**10.55** «Бульбаны», мультсерыял:.
**11.05, 16.05** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 24 серыя.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**13.10** «Паэма веры», дак. фільм, Беларусь.
**13.55** «Мой родны горад», серыял.
**14.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**14.25** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Васіль Цяпінскі».
**14.35** «Зграя», сенсацыйны серыял.
**15.35** МакраФон: «Бардаўская восень–2007»: выступ Віктара Шалкевіча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.30** «Доктар Марцін», серыял.
**18.20** Мультклуб: «Малітва».
**18.25** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Міндоўг».
**18.35** «Бяссонныя плыні», дак. фільм, дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**19.15** Сальда (эканамічная праграма).
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах.
**20.20** Навігатар.
**20.35** Вагон.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Без рэтушы: «Крыжы Беларусі», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**21.40** Эксперт.
**22.05** «Забытае свята», маст. фільм, Чэхія.
**23.45** Аб'ектыў.
**00.10** Гарачы каментар.

## 17 ЛЮТАГА, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10, 18.50, 02.15** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**12.10** Меладрама «Зусім іншае жыццё» (Украіна). 2-я серыя.
**14.05** Дак. цыкл «У пошуках ісціны».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў».
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**22.00** Прэм'ера. Драма «Браты» (ЗША).
**00.05** Дак. цыкл «Зброя будучыні» (ЗША).
**00.55** Самба. Этап Кубка свету.
**02.20** Дзень спорту.

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.15** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Доктар Тырса». Шматсер. фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Залаты капкан». Шматсерыйны фільм.
**23.30** Навіны спорту.
**23.35** «Скарбашукальнікі».
**00.35** «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**01.25** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**09.30** «Дабро пажаліцца».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Серыял.
**14.40** «Халасцякі». Серыял.
**15.30** «Хірамант». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «Хірамант». Серыял.
**23.50** «Пантэра». Серыял.

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.35** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.40** «Апошняя з рымлян». Дак. фільм.
**11.40** Жансавет.
**12.20** «Бітва экстрасэнсаў».
**13.20** Дача здароўя.
**13.55** Камедыйны серыял «Прыгоды салдата Івана Чонкіна» (Расія). 4-я серыя.
**14.45** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.45** Пазакласная гадзіна.
**16.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Беларуская часіна.
**19.50** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. БАТЭ – Пары Сэн Жэрмен. Прамая трансляцыя.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Базель - Спартак. Прамая трансляцыя.
**00.00** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Кошт зорнай ролі». Дак. фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Капітан Гардзееў».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** Прэм'ера. «Рускі шакалад». Тэлесерыял.
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Таямніца святога Патрыка».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Капітан Гардзееў».
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.45** «Паядынак».

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай.
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Вочная стаўка».
**11.15** «Таямнічая Расія».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Вострасюжэтны серыял «Ментоўскія войны».
**15.15** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.45** Серыял «Пагоня за ценем».
**21.40** Прэм'ера. Баявік «Святаяннік».
**22.35** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Янг Бойз (Швейцарыя) - Зеніт (Расія).
**00.35** Крымінальны баявік «Зграя».

**09.30** Дзюдо. «Мастэрс» (Баку, Азербайджан). Агляд.
**10.00** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Мужчыны. Слалам, камбінацыя.
**10.45** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Слалам-гігант. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.00** Тэніс. Турнір WTA у ААЭ (Дубай). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**13.45** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Слалам-гігант. 1-я спроба.
**14.15** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**15.30** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ньюпарт, Вялікабрытанія). Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**19.00** Тэніс. Турнір WTA у ААЭ (Дубай). 1/8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**20.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Агляд.
**20.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**20.55** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ньюпарт, Вялікабрытанія). Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**00.05** Вось дык так!!!
**00.15** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**00.45** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.45** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба.

**07.20** Гарачы каментар.
**07.35** На колах.
**08.05** Сальда (эканамічная праграма).
**08.20** Эксперт.
**08.45** Без рэтушы: «Крыжы Беларусі», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**09.05** «Мой родны горад», серыял.
**09.30** «Доктар Марцін», серыял.
**10.15** «Забытае свята», маст. фільм, Чэхія.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** На колах.
**12.30** Госць «Белсату».
**12.50** Навігатар.
**13.05** Сальда (эканамічная праграма).
**13.20** Эксперт.
**13.45** Без рэтушы: «Крыжы Беларусі», рэпартаж, 2011 г., Беларусь.
**14.05** «Мой родны горад», серыял.
**14.30** «Бяссонныя плыні», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**15.10** «Доктар Марцін», серыял.
**16.00** «Фотааматар», дак. фільм, Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Школа на санцапёку», серыял.
**17.30** «Забытае свята», маст. фільм, Чэхія.
**19.15** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Пачатак канстытуцыйнага права ў Беларусі».
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Праект «Будучыня».
**20.15** Басанож па свеце: «Розум».
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.50** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял: 7 серыя.
**22.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Пасол Спасоўскі», дак. фільм, 2009 г., Польшча.
**23.30** Аб'ектыў.
**23.55** Гарачы каментар.

## 20 ЛЮТАГА, НАДЗЕЛЯ

**1**

**08.05** Мультфільмы.
**08.45** «Зброя». Цыкл дак. фільмаў.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** У свеце матораў.
**10.15** «Культурныя людзі».
**10.50** Камедыйны серыял «Сваты-3» (Украіна). 1-я серыя.
**12.15** Дэтэктыўны серыял «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана» (СССР).
**13.50** Сінематэка.
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Відэафільм АТН «Млын моды. Auto Party у Берліне «.
**16.00** Камедыя «Дадатковы час» (Расія).
**17.45** «OFF STAGE LIFE».
**18.05** Суперлато.
**19.15** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**22.30** Крымінальная камедыя «Рабаванне па-французску» (ЗША-Канада-Францыя-Вялікабрытанія).

**ОНТ**

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.15** «Фазэнда».
**11.55** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.30** Камедыя «Афоня».
**14.10** «КВЗ. 50 віртуальных гульняў».
**15.00** АНТ прадстаўляе: «Брэйн рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Давай ажэнімся!».
**17.30** Прэм'ера АНТ. «Эстрадны кактэйль».
**18.45** Прэм'ера АНТ. «Зачыстка».
**20.00** Контуры.
**21.05** «Вялікая розніца».
**22.10** Прэм'ера. «Ні хвіліны супакою…». Юбілейны канцэрт.
**00.20** «Шоў ні бэ ні мэ няхіла».
**00.50** Вынікі Берлінскага кінафэсту.

**СТВ**

**06.05** «Кароль Дроздабарод». Германія, 2008 г.
**07.05** Фільм «Марлі і я». ЗША, 2008 г.
**09.00** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «Яны ваявалі за Радзіму». СССР, 1975г. Заключная серыя.
**15.25** «Далёкія сваякі».
**15.35** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М. Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.40** Фільм «Ягуар». Францыя, 1996 г.
**22.40** «Кубак свету па грэка-рымскай барацьбе».
**00.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**ЛАД**

**07.25** Дабравест.
**07.50** Мір вашай хаце.
**08.05** «Першы пасля Бога». Ваенная драма (Расія).
**10.00** Медычныя таямніцы.
**10.40** Медычныя таямніцы +.
**10.55** Школа рамонту.
**12.00** Тэлебарометр.
**12.05** Нашы тэсты.
**12.45** Кінаспробы.
**13.05** «Правы чалавека».
**13.20** Бухта капітанаў.
**14.00** «Падарожжа да цэнтра Зямлі». Прыгодніцкая фантастыка (ЗША-Канада).
**15.50** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**16.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - Металург (Магнітагорск). Прамая трансляцыя.
**19.15** «Гэты дзіўны свет». Дакументальны фільм (Белтэлерадыёкампанія).
**19.45** Смешная часіна.
**20.20** «Навіны надвор'я».
**20.45** Камедыя «Хачу ў турму» (Расія).
**22.35** Культасвет.
**23.05** Канцэрт «Pink. Live from Wembley Arena « (ЗША).

**РОССИЯ**

**07.00** Мультфільмы.
**07.50** Тэлесерыял «Цыганачка з выхадам».
**11.00** Вестки.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Мультфільмы.
**12.35** Фільм «Імгненне поспеху».
**14.00** Вестки.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Рамантыка рамана».
**15.35** «Раман з серыялам». Дак. фільм.
**16.35** Фільм «Вершнік без галавы».
**18.30** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2011.
**23.55** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.55** Фільм «Свая чужая сястра».

**НТВ**

**07.00** Мультфільмы.
**07.40** Фільм «Пацалунак матыля».
**09.20** Фільм «Мелодыя кахання». 2011 г.
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Мультфільмы.
**12.40** Фільм «Леташняя кадрыля».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Рамантыка рамана».
**15.40** «Птушка шчасця Мікалая Гнацюка». Дакументальны фільм.
**16.40** Фільм «А світанкі тут ціхія...».
**18.25** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2011.
**23.55** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.55** Фільм «Апошні забой».

**EUROSPORT**

**09.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Слалам. 2-я спроба.
**10.00** Санкавы спорт. Кубак свету ў Латвіі (Сігулда). Жанчыны. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**10.45** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Мужчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**11.45** Санкавы спорт. Кубак свету ў Латвіі (Сігулда). Жанчыны. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Нарвегіі. Жанчыны. 10 км класічным стылем.
**13.00** Санкавы спорт. Кубак свету ў Латвіі (Сігулда). Камандныя спаборніцтвы. Прамая трансляцыя.
**13.50** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Мужчыны. Слалам. 1-я спроба.
**14.15** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Мужчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**15.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Нарвегіі (Драмен). Спрынт. Прамая трансляцыя.
**15.55** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**16.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ньюпарт, Вялікабрытанія). Фінал. Прамая трансляцыя.
**18.30** Тэніс. Турнір WTA у ААЭ (Дубай). Фінал. Прамая трансляцыя.
**19.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Нарвегіі (Драмен). Спрынт.
**20.00** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Агляд.
**20.15** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ньюпарт, Вялікабрытанія). Фінал.
**21.00** Снукер. Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ньюпарт, Вялікабрытанія). Фінал. Прамая трансляцыя.
**00.00** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі WBO.
**01.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Мужчыны. Слалам. 2-я спроба.

**БЕЛСАТ tv BELSAT**

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**08.35** «Зорны пірат», серыял: 2 серыя.
**09.05** Калыханка для самых маленькіх.
**09.35** МакраФон: «Рок-карона: 1994–1996», архіўныя запісы: ч. 3.
**10.05** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Беларусы ў Грунвальдскай бітве».
**10.20** Навігатар.
**10.35** «Чарнобыль для Еўропы», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**11.05** Вагон.
**11.10** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Асколкі», дак. фільм, 2011 г., Беларусь.
**11.55** «Рэаліці-шоу: выбары», рэпартаж, 2010 г., Польшча.
**12.15** Еўропа сёння.
**12.45** «Зорны пірат», серыял: 2 серыя.
**13.10** Калыханка для самых маленькіх.
**13.40** «Камунізм – гісторыя адной ілюзіі», дак. фільм, 2005 г., Германія: 1 серыя, «Ленінская рэвалюцыя».
**14.35** «Адбыты тэрмін», маст. фільм, 1999 г., ЗША.
**16.05** «Ранча», серыял: 34 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.15** «Час гонару», серыял: 17 серыя.
**18.05** Прыватная калекцыя.
**18.40** Дакументальная гадзіна: «Лобатамія», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**19.40** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Контррэфармацыя ў Вялікім Княстве Літоўскім».
**20.05** ПраСвет.
**20.30** Басаnож па свеце: «Знахар».
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт.
**21.55** Фільматэка майстроў: «Кэндзі», маст. фільм, 2006 г., Аўстралія.
**23.40** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Супольнае жыццё».
**23.50** Тыдзень у «Аб'ектыве».

## Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Віцебск: (8 029) 3084978, Юрый;
Масты: (8 029) 1264692, Язэп;
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей;
(8 029) 178 31 68, Вольга.

ф. ПС 112

БЕЛПОЧТА

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739

УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня

Кассир Всего

### Шаноўныя чытачы!

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

**Для тых, хто прымае рашэнні!**
Новы час
**www.novychas.org**

МЕРКАВАННЕ

# ЕГІПЕЦКАЯ ВАНДЭЯ

**У рэпартажах з Каіру апошнім часам часта паведамляецца пра масавыя сутычкі праціўнікаў і прыхільнікаў Мубарака. Што за людзі выступаюць супраць рэформаў? Пра асаблівасці егіпецкай контррэвалюцыі журналіст «НЧ» Алег Новікаў гутарыць з маскоўскім палітолагам, спецыялістам па Усходу Маркам Васільевым.**



***— Ці было з'яўленне на вуліцах арміі прыхільнікаў Мубарака сюрпрызам для тых, хто займаецца сталым маніторынгам сітуацыі ў Егіпце?***

— І так, і не. Спарадычныя вулічныя акцыі пратэсту выйшлі за рамкі ачаговых выступаў. Стала відавочна, што гаворка ідзе пра нацыянальнае паўстанне. Адначасова ўзнікла думка, што мы назіраем рымэйк нядаўніх туніскіх падзей. Здавалася, што грамадства, сытае па горла 30-цю гадамі кіравання Хосні Мубарака, хутка прымусіць прэзідэнта ўцякаць у эміграцыю. Аднак пазней ход падзей змяніўся. Супрацьстаянне набыло працяглы характар. У тым ліку таму, што нечакана ў рэжыму знайшліся прыхільнікі ў народзе, якія таксама пайшлі на вуліцы.

***— Чаму ніхто не пралічыў тое, што ў Мубарака могуць знайсціся свае прыхільнікі, прычым у такой колькасці?***

— Яшчэ ўчора ў палітычным плане цяперашнія прыхільнікі рэжыму былі дастаткова пасіўныя, адсутнічалі арганізацыйныя структуры, ім бракавала сістэмнага бачання сітуацыі ў краіне. Я думаю, яны нават ненавідзелі Мубарака. Выключэннем былі хіба што копты (хрысціянская меншасць). Увогуле, за 30 год усе прызвычаіліся, што ў Егіпце ўсё вызначае вертыкаль. А там апошнім часам адбываліся цікавыя працэсы, якімі галоўным чынам і цікавіліся эксперты. Нагадаю, што на восень у Егіпце прызначаны прэзідэнцкія выбары. Мубарак збіраўся сысці, аднак не спяшаўся называць прозвішча афіцыйнага пераемніка. Ішла кансалідацыя розных фракцый апаратчыкаў вакол той ці іншай кандыдатуры. А калі пачалася рэвалюцыя, усе палітолагі селі ў лужу. Дзяржаўныя інстытуты, за выключэннем войска, аказаліся паралізаванымі. Паліцыя разбеглася пасля першых сутычак з маніфестантамі, а кіруючая ў краіне Нацыянал-дэмакратычная партыя проста развалілася.

***— Да якіх сацыяльных катэгорый насельніцтва належаць тыя, хто жадае захавання ў Егіпце статус-кво?***

— Выдзяляюць як мінімум тры дастаткова вялікія групы насельніцтва, лаяльныя прэзідэнту, — турыстычны бізнес, насельніцтва Поўдня і копты. Акрамя таго, армія прыхільнікаў Мубарака папаўняецца за кошт часткі беднага насельніцтва вялікіх гарадоў (толькі ў Каіры такіх людзей мільён). У час крызісу яны аказаліся вельмі залежныя ад дзяржаўных праграм сацыяльнай падтрымкі і зараз вельмі баяцца вакууму ўлады — адзінай крыніцы іх выжывання. З іншага боку, ніякіх палітычных ініцыятываў люмпен не праяўляе. Гэта неактыўная частка грамадства.



Людзі баяцца, што з прыходам да ўлады «Братоў мусульман» еўрапейцы ўвогуле не захочуць адпачываць на Чырвоным моры. Па інерцыі адзінай альтэрнатывай выступае Мубарак

***— Чаму турыстычны бізнэс вы разглядаеце як асобнага палітычнага акцёра?***

— Калі мы кажам пра турыстычны бізнес, мы гаворым не толькі пра ўладальнікаў буйных гатэляў. Гэта цэлая індустрыя. Кожны год Егіпет наведвала 15 мільёнаў турыстаў. У гэтай сферы працуе дзесяць працэнтаў насельніцтва краіны, якія хутка адчулі на сваёй скуры наступствы рэвалюцыі. За час бязладдзя з-за адтоку турыстаў краіна страціла мільярд долараў. У карпаратыўнай свядомасці занятых у турсектары бізнэсоўцаў хутка ўзнікла думка, што ва ўсім хаосе вінаватыя апазіцыянеры. Людзі баяцца, што з прыходам да ўлады «Братоў мусульман» еўрапейцы ўвогуле не захочуць адпачываць на Чырвоным моры. Па інерцыі адзінай альтэрнатывай выступае Мубарак і ягоны рэжым. Прычым абараняць Хосні тураператары гатовыя сур'ёзна. Калі на экранах тэлебачання паказваюць прыхільнікаў Мубарака на вярблюдах, трэба ведаць, што гэта не сяляне-правінцыялы. Гэта моладзь, якая раней звычайна тусавалася пад пірамідамі і зарабляла грошы на тым, што фатаграфавала турыстаў у кампаніі тых жа самых вярблюдаў. Не стала турыстаў — не стала працы. Прыйшлося сядлаць вярблюда і ехаць змагацца.

***— А што яшчэ за людзі з Поўдня?***

— Жыхары паўднёвых правінцый. Для гэтых рэгіёнаў характэрныя не толькі эканамічная адсталасць, аднак і вялікая актыўнасць ісламскіх экстрэмістаў. Кволы мір тут трымаецца за кошт прысутнасці войска і датацый з цэнтру. Верагоднасць пачатку грамадзянскай вайны для тутэйшых — не ўтопія, а абсалютна рэальная перспектыва. Адсюль масавая праўладная пазіцыя. Натуральна, сваю ролю адыгрывае характэрны рэцыдыў нянавісці правінцыялаў да сталіцы.

***— Копты таксама сталі ахвярамі рэвалюцыйных часоў?***

— Думаю, што яны баяцца імі стаць. Зараз буйныя хрысціянскія кварталы патрулююцца фармаваннямі самаабароны. Вакол храмаў стаяць барыкады. Свой страх копты тлумачаць адсутнасцю прадказальнай будучыні ў выпадку прыходу да ўлады радыкальных ісламістаў. Нагадаю, што ў мінулым годзе ў краіне мелі месца пагромы хрысціян. Барыкады і патрулі — не толькі ахоўная рэакцыя. Праводзяцца маніфестацыі ў падтрымку Мубарака. Копцкі епіскап Александрыі адкрытым тэкстам кажа, што хрысціяне Егіпту патрабуюць, каб Мубарак застаўся. У крайнім выпадку яны згодныя на рэформы, аднак пад яго кантролем. Апазіцыя, у сваю чаргу, намагаецца заспакоіць хрысціянскую грамаду. Раней «Браты мусульмане» заявілі, што ў выпадку прыходу да ўлады яны гарантуюць хрысціянам тыя ж правы, што і мусульманам.

***— Ці здолее Мубарак зацягнуць новых саюзнікаў у праўладную партыю?***

— Гэта будзе залежаць ад фармату перадачы ўлады новаму дэмакратычна абранаму ўраду. Калі ў хуткім часе адбудуцца выбары, афіцыйная Нацыянал-дэмакратычная партыя можа выйграць на страху перад пераменамі. Аднак наўрад ці ўдасца стварыць сталую сацыяльную базу з тых жа тураператараў. Іх падтрымка Мубарака вельмі сітуацыйная. Цалкам вярнуцца ў старыя часы ўжо немагчыма — гэта пачынаюць разумець усе. Відавочна, што вяртанне да нармальнага жыцця і стабільнасці зараз магчымае выключна праз пошук кампрамісу паміж палітычнымі апанентамі. А Мубарак не з'яўляецца кампраміснай фігурай.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Не выключана, зрэшты, што і ў нас знойдуцца людзі, якія запатрабуюць ад улады чаго-небудзь беларускага. Напрыклад, павагі да апанентаў падчас выбарчага працэсу. Але наўрад ці гэта менавіта тое, што трэба рэспубліцы цяпер, нават калі рабіць зніжку на вядомае жаданне любога аўтарытарнага рэжыму падчас выбараў прадэманстраваць уласную дэмакратычнасць. Па-першае, у такіх настрояў у грамадстве няма падтрымкі. Па-другое, як ужо паказаў Лукашэнка сваёй гульнёй у паддаўкі, лібэральнасць дыктатара для тых, хто на яе купіўся, усё адно заканчваецца наручнікамі.

**«Республика» (Казахстан)**

19 снежня — гэта вельмі трагічны момант для Беларусі. У ЕС абураныя, што спадар Лукашэнка проста ашукаў двух міністраў замежных спраў еўрапейскіх дзяржаў, гледзячы ім у вочы. Цяпер гэта пытанне нават не столькі рацыянальнай палітыкі, колькі эмоцый людзей, якія абураны падманам і жадаюць паказаць, што гэтак рабіць нельга.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Паўтору малочнай вайны з Расіяй Лукашэнка наўрад ці жадае. Санкцыі ЗША і ЕС літаральна прыперлі Мінск да крамлёўскай сцяны. А там па-ранейшаму жадаюць толькі аднаго: павыкупляць рэнтабельныя беларускія прадпрыемствы, і чым мага танней. Таму і пачаў Лукашэнка вялікую прыватызацыю. 2011 год быў абвешчаны ў Беларусі «годам прадпрымальнасці». Гэта значыць, ён стане годам знішчэння сацыяльнай скіраванасці беларускай эканомікі, росту беспрацоўя і няроўнасці. Аднак абвесціць пра гэта вось так проста Бацька не можа — гэта было б прызнаннем паразы. Адгэтуль важная тактычная задача: замаскіраваць масавы распродаж. Адгэсюль і публічны разнос, якога ў «Юнимилке», дарэчы, не спалохаліся. Тым часам, малако — не адзіная і не галоўная прыкмета таго, што Бацька саступае ціску прыватызатараў з Масквы. Так, у канцы мінулага тыдня ён прызначыў кіраўніком самай важнай стратэгічнай галіны — нафтахіміі — расійскага менеджэра Ігара Жыліна.

**«Росбалт» (Расія)**

Шматлікія еўрапейскія лідары маюць справы з А.Лукашэнкам, але ў ЕС гэта прынята рабіць таемна, не афішуючы дадзеныя сустрэчы, а не так адкрыта, як прэзідэнт Літвы Грыбаўскайтэ, блытаючы публічную палітыку з прыватнай. Адносіны Літвы з Польшчай і Беларуссю вельмі шкодзяць яе міжнароднаму іміджу і выклікаюць супраць Літвы грамадскую думку ў Еўрасаюзе.

**«Economist» (Вялікабрытанія)**

Тым часам афіцыйны Мінск, нягледзячы на ўсе чаканні сусветнай грамадскасці, намерау змякчыць сітуацыю не дэманструе. Эксперты ў Мінску адзначаюць, што ўпартасць Лукашэнкі ўжо выклікае раздражненне нават у Масквы, якая першапачаткова займала мякчэйшую пазіцыю, чым Брусэль і Вашынгтон. Глава МЗС РФ Сяргей Лаўроў заявіў пра тое, што лічыць «непрымальнымі» арышты палітычных апанентаў Лукашэнкі. «Беларусь — наша братэрская краіна, стратэгічны партнёр, але гэта не значыць, што мы заплюшчым вочы на парушэнне асноўных правоў і свабодаў», — сказаў ён.

**«Независимая газета» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### РАСІЯ. ВАЙНА ЗА ФЕЛЬДМАРШАЛА ПАЎЛЮСА

У Валгаградзе набірае моц скандал вакол цэнтральнага ўнівермага (ЦУМ). У 1943 годзе гітлераўскі фельдмаршал Паўлюс быў узяты ў палон менавіта ў падвале будынка ўнівермага. Абласная адміністрацыя нечакана ўзгадала гэты факт і вырашыла зачыніць краму, каб перарабіць ЦУМ у цэнтр патрыятычнага выхавання «Перамога». Камерсанты супраць. Яны звярнуліся з лістом да прэзідэнта Мядзведзева з просьбай умяшацца ў сітуацыю і перашкодзіць губернатару Анатолю Броўку зачыніць ЦУМ. Пры гэтым яны спасылаюцца на тое, што за свае грошы адчынілі на адным з павярхаў ЦУМу бясплатны музей, які прысвечаны абставінам узяцця Паўлюса ў палон. Аўтары звароту ўпэўненыя, што губернатар агучыў ідэю зачынення ўнівермага, не задумваючыся пра наступствы, падазраюць, што ён увогуле жадае прыватызаваць нерухомасць. Прадпрымальнікі прапануюць знайсці для патрыятычнага цэнтра «які-небудзь гадамі пустуючы будынак, дзе не вядзецца ніякай гаспадарчай дзейнасці». Чым усё гэта закончыцца, цяжка сказаць, але Крамлю дакладна не падабаецца, што яго прадстаўнік выклікае рост негатыўных настрояў на адрас прэзідэнцкай вертыкалі.

**Па матэрыялах расійскай прэсы**

### ПОЛЬШЧА. ЛІБЕРАЛЫ ПАТРАБУЮЦЬ ВЯРНУЦЬ ПОМНІК ЛЕНІНУ

Улады гораду Паронін, што ў Кракаўскім ваяводстве Малой Польшчы, вырашылі аднавіць помнік Леніну, які стаяў тут у часы камунізму. Самае смешнае, што горадам кіруюць лібералы з партыі «Грамадзянская платформа» (PO). Каменны Ульянаў ім спатрэбіўся выключна ў камерцыйных мэтах. Бацькі гораду пралічылі, што манумент правадыру пралетарыяту справакуе турыстычны бум. Такія разлікі будуюцца на канкрэтных апытаннях. Уладальнікі гатэляў кажуць, што турысты абавязкова пытаюцца пра помнік, які калісьці стаяў тут і быў добра вядомы ва ўсёй Польшчы. Так здарылася, што менавіта ў Пароніне, які ўваходзіў да рэвалюцыі ў склад Аўстра-Венгрыі, у 1913-м і 1914 гадах жыў Уладзімір Ленін, тут ён правёў так званую «Жнівеньскую» нараду ЦК РСДРП. У 1948 годзе ў доме, дзе праходзіла нарада, адкрылі музей, а ў горадзе ўсталявалі помнік. Пасля краху камунізму помнік разбурылі, аднак зараз падыходы да Леніна змяніліся. «Паронін у час капіталізму павінен выкарыстаць свой маркетынгавы шанец», — кажа адзін з кіраўнікоў ваяводства. Гэта ідэя раскалола малапольскую секцыю «грамадзянскай платформы». Яе старая фракцыя ў часы «Салідарнасці» спрабавала падпаліць будынак музею.

**Па матэрыялах «Lewica» (Польшча)**

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ. АСУДЖАНЫ ЛІДАР ШАТЛАНДСКІХ САЦЫЯЛІСТАЎ



Томі Шэрыдан, былы старшыня Шатландскай сацыялістычнай партыі (SSP), а зараз лідар групы «Шатландскі сацыялістычны рух», атрымаў тры гады турмы. Томі асудзілі за тое, што ён казаў няпраўду на судзе падчас працэсу «Шэрыдан супраць газеты «News of the World». Журналісты «News of the World» абвінавацілі сацыяліста ў забойстве былой жонкі і адкрыцці секс-клубу для свінгераў. Той працэс Шэрыдан выйграў, аднак пры гэтым паспеў абразіць усіх. Сам Томі кажа, што стаў ахвярай змовы, у якой удзельнічаюць буржуі (уладальнік «News of the World» — вядомы алігарх Руперт Мэрдак) і былыя сябры па SSP. Некалькі гадоў таму ў партыі адбыўся канфлікт, удзельнікі яго дасюль ненавідзяць адзін аднаго. Пакуль Томі будзе сядзець у турме, яго справу працягне жонка. Пра гэта Гэйл Шэрыдан заявіла адразу пасля абвяшчэння прысуду.

**Па матэрыялах брытанскай прэсы**

### ФРАНЦЫЯ. РЭВАЛЮЦЫЯМ ПРЫДУМАЛІ НАЗВЫ

У той час, як на берагах Ніла ідзе супрацьстаянне прыхільнікаў і праціўнікаў Хосні Мубарака, у французскай прэсе і на інтэрнэт-форумах разгарнулася палеміка наконт таго, як назваць падзеі ў Егіпце. У выніку апытання вырашана называць іх «папірусная рэвалюцыяй». Аднак справа гэтым не абмежавалася. Французам вельмі спадабалася прыдумваць рэвалюцыям назвы. Такім чынам, калі раптам рэвалюцыя адбудзецца ў Францыі, яе назавуць «рэвалюцыя сыру», у Бельгіі — «піўная рэвалюцыя». Дарэчы, на думку палітолагаў, у Бельгіі сапраўды ў бліжэйшы час могуць пачацца цікавыя працэсы з-за ўрадавага крызісу. Гэта засведчыла 50-тысячная дэманстрацыя напрыканцы снежня.

**Па матэрыялах «Le Monde» (Францыя)**

ЭКАЛОГІЯ

# ЧОРНАЕ ЗОЛАТА АРКТЫКІ

Алег НОВІКАЎ



**Зялёныя ўсёй планеты раз'юшаныя: канцэрн «British Petroleum» (BP) — нафтавы гігант, адказны за экалагічную катастрофу ў Мексіканскім заліве, — збіраецца пачаць нафтаздабычу ў расійскай Арктыцы.**

14 студзеня СМІ нечакана паведамілі пра тое, што «Роснефть» і BP дамовіліся пра стварэнне стратэгічнага альянсу. Праз тыдзень, 26 студзеня, абедзве кампаніі падпісалі дамову пра партнёрства для сумеснага засваення вуглевадародаў у расійскай частцы Арктыкі.

Паводле дамовы, згаданыя кампаніі ствараюць сумеснае прадпрыемства, якое будзе займацца геалагічнай разведкай і эксплуатацыяй трох перспектыўных нафтагазаносных участкаў на шэльфе Карскага мора. Тут, як адзначае расійскае Міністэрства прыродных рэсурсаў, знаходзіцца 37,4% усіх патэнцыйных запасаў вуглевадародаў на кантынентальным шэльфе Расіі.

Навіна пра стварэнне картэлю — нібыта гром у ясны дзень. Усе былі ўпэўнены, што пасля аварыі на платформе Deepwater Horizon у мексіканскім заліве ў 2010 годзе рэпутацыя *BP* пахаваная надоўга.

Пра маштабы экалагічнага злачынства *BP* кажуць лічбы. Пасля аварыі ўзнікла нафтавая пляма акружнасцю ў 965 кіламетраў. Яна стварыла пагрозу пляжам і раёнам рыбалоўнай здабычы, якія адыгрываюць найважнейшую ролю ў эканоміцы прыбярэжных штатаў ЗША. Велізарная шкода нанесеная прыродзе рэгіёна. Навукоўцы кажуць, што разліў нафты ў Мексіканскім заліве негатыўна паўплываў на хуткасць Гальфстрыму і на надвор'е ва ўсёй Еўропе.

5 студзеня 2011 года ўрадавая камісія ЗША, створаная па ініцыятыве прэзідэнта Абамы, назвала адной з прычынаў катастрофы скарачэнне кампаніяй *BP* і яе партнёрамі сродкаў на бяспеку здабычы нафты.

Як сказаў Майк Чайлдс, лідар руху «Сябры зямлі»: «З улікам наступстваў катастрофы ў зоне Мексіканскага заліва, BP па праву заслужыла першы прыз у намінацыі «галоўны вораг прыроды». Спатрэбіцца некалькі гадоў, каб кампанія магла пазбавіцца гэтага іміджу». Так яно, здаецца, нейкі час і было. Напрыклад, у снежні мінулага года ўрад Грэнландыі адмовіў *BP* у праве здабываць нафту ў сваіх тэрытарыяльных водах.

Але дзякуючы кантракту з «Роснефть» «British Petroleum», падобна, выкруцілася.

Эколагі рыхтуюцца пратэставаць. Для іх прынцыпова не толькі не пусціць кампанію з такой рэпутацыяй у Арктыку, важна не стварыць прэцэдэнт здабычы нафты ў палюсных шыротах.

Эколагі адзначаюць: «Эксплуатацыя нетраў Арктыкі павінна быць забаронена, паколькі Арктыка — унікальнае месца, дзе захаваўся першапачаткова прырода. Гэта прыродная сістэма вельмі ўразлівая і далікатная, і наша задача — шукаць сродкі яе абароны, а не разбурэння».

Дакс Лавергроў, прадстаўнік брытанскага філіялу міжнароднага Фонду дзікай прыроды, папярэджвае, што эксплуатацыя нафтавых запасаў у Арктыцы яшчэ больш складаная, чым у Мексіканскім заліве. У Арктыцы значна менш спосабаў аператыўна рэагаваць на аварыйныя сітуацыі. Напрыклад, менш магчымасцяў прыцягнуць у выпадку надзвычайнага становішча аварыйныя судны, таму што навігацыя ў Карскім моры доўжыцца толькі 3–4 месяца на год. Эколагі таксама выступаюць супраць прац на шэльфе, пакуль не будуць ліквідаваныя прабелы ў ведах пра мясцовую экасістэму і не будуць створаны эфектыўныя механізмы барацьбы з разлівам нафты.

У экалагічных арганізацыях адзначаюць, што ліцэнзійныя ўчасткі знаходзяцца ў непасрэднай блізкасці ад некалькіх ахоўваемых тэрыторый, напрыклад, нацыянальнага парку «Руская Арктыка». Парк уключае паўночную тэрыторыю архіпелага Новая Зямля, тут знаходзяцца найбуйнейшыя ў паўночным паўшар'і птушыныя калоніі, калоніі маржоў, а таксама адзін з найважнейшых арэалаў папуляцыі белага мядзведзя.

Эколагі ўжо дзейнічаюць. Перш за ўсё, яны звярнуліся да ўладальнікаў акцый «British Petroleum». Іх пасланне наступнае: як вы можаце дазволіць дырэкцыі інвеставаць вашы грошы ў новыя праекты, пасля таго, як кампанія праматала 20 мільярдаў долараў на Deepwater Horizon? Усяго кампанія павінна выкласці за ачыстку заліва 40 мільярдаў.

Доля авантурызму тут ёсць. Вось што піша пра матывы ўладальнікаў кампаніі брытанскае выданне «Chatam House»: «Цяпер, ва ўмовах праблем, якія зваліліся на кампанію, «British Petroleum» вырашыла пайсці на новыя істотныя капіталаўкладанні ў Расіі. Крытыкі *BP* угледзелі ў гэтым роспач, якая выклікана праблемамі кампаніі ў Мексіканскім заліве».

У амерыканскім сенаце тым часам кажуць, што тут не абышлося без карупцыі. «Не магу зразумець, як руская даверыліся BP, пасля таго, як катастрофа ў Мексіканскім заліве абышлася амерыканцам у мільярды долараў», — кажа адзін з сенатараў. Адначасова амерыканскія палітыкі прапануюць дзеля жарту перайменаваць «British Petroleum» у «Петролеум Вялікі».

На шчасце абаронцаў Арктыкі, у праекта *BP* — «Роснефть» узнікла шмат арганізацыйных і прававых недапасаванняў. 27 студзеня кансорцыум *AAP* (саўладальнік ТНК-*BP* — даччынай кампаніі «British Petroleum»), звярнуўся ў Лонданскі суд з просьбай прыпыніць працу на арктычным шэльфе. Акцыянеры *AAP* кажуць, што іх «кінулі». Паводле дамовы, усе свае праекты ў Расіі, а таксама на Украіне, партнёры брытанскай кампаніі рэалізуюць толькі праз ТНК-*BP*. 2 лютага суд вынес рашэнне пра прыпыненне дамоўленасці паміж «Роснефтью» і *BP*.

Але радавацца эколагам рана. Наўрад ці канцэрны так проста адмовяцца ад ідэі, у якую ўжо інвеставалі шмат грошай і рэсурсаў.

Акрамя таго, сваё вока на арктычную нафту паклалі іншыя кампаніі. Усё той жа «Chatam House» адзначае: «Стагоддзе лёгкадаступнай нафты прайшло, і нафтавы бізнэс XXI стагоддзя паказвае, што дзеля пошуку нафты і газу неабходна ўступаць у рызыкоўныя партнёрскія адносіны з нестабільнымі палітычнымі рэжымамі, дзейнічаць у цяжкіх і вельмі складаных прыродных умовах».

ЮБІЛЕЙ

# КАМЕДЗІ РЭЙГАН

Алег НОВІКАЎ

**6 лютага ў ЗША адсвяткавалі 100-ю гадавіну з дня нараджэння Рональда Рэйгана. Рэйган увайшоў у гісторыю не толькі як прэзідэнт, які перамог «Імперыю зла». Яшчэ пры жыцці ён праславіўся як палітык з выключным пачуццём гумару.**





Спадчыну Рэйгана ў гісторыі Штатаў цяжка пераацаніць. Не дзіўна, што да стогадовага юбілею Рэйгана пабачылі свет шмат прысвечаных яму кніг, артыкулаў і мемуараў. Іх аўтары ўзгадваюць таксама і рэйганаўскі гумар, які быў важнай часткай ягонага палітычнага стылю.

Рэйган, безумоўна, ад нараджэння меў добрае пачуццё гумару. Класікай сталі менавіта ягоныя спантанныя рэплікі, якія ён складаў амаль на ўзроўні інстынкту. Напрыклад, у 1981 годзе, калі на Рэйгана быў зроблены замах, апрытомнеўшы ў шпіталі, ён найперш запытаў у дактароў: «Спадзяюся, вы тут усе рэспубліканцы?»

Рэйганазнаўцы адзначаюць, што значэнне гумару ў публічным жыцці Рэйган цалкам зразумеў, калі пісаў сцэнары для выступаў на радыё, тэзісы для сваіх прамоў у якасці актывіста акцёрскага прафсаюзу, занатоўкі для спартовых каментарыяў.

Нельга не згадаць, што Рэйган расказваў свае жарты як сапраўдны акцёр — адбілася школа Галівуду. Ён шырока ўсміхаўся, заўжды вытрымліваў патрэбную інтанацыю, адчуваў дынаміку настрояў у аўдыторыі, імправізаваў.

Напэўна, упершыню гумар Рэйгана краіна ацаніла ў 1968-м. У той час ён быў губернатарам Каліфорніі. Неяк яму прыйшлося сутыкнуцца на вуліцы з маніфестацыяй студэнтаў хіпі. Калону ўзначальваў валасаты хлопец з транспарантам «Make Love, Not War» (англ: Рабі каханне, а не вайну). Рэйган паглядзеў на надпіс, пасля на хлопца і сказаў: «Наўрад ці ты можаш рабіць нешта іншае».

Другі жарт з яго каліфарнійскага жыцця звязаны з дыспутам з тымі ж студэнтамі хіпі. Яны казалі, што Рэйган надта стары і таму не разумее генерацыю, якая вырасла ў эру атамнай бомбы і палётаў ракет у космас. «Так, — прызнаўся Рэйган, — у нас не было ракет і бомбаў. Мы прыдумалі іх».

З часам палітык ператварыў свае жарты ў свайго роду сапраўдную зброю.

Ён занатоўваў праколы сваіх праціўнікаў, каб пасля выставіць іх на смех. У 1984 годзе на Нацыянальнай канвенцыі кандыдат ад дэмакратаў Уолтэр Мандэйл назваў рэйганаўскі ўрад «урадам амнезіі». Адказ не прымусіў сябе доўга чакаць. На першай жа сустрэчы з журналістамі Рэйган сказаў: «Тут я чуў, што мой урад абвінавацілі ў амнезіі. Якая хлусня! Дарэчы, я забыў, хто гэта сказаў».

Калі яго крытыкавалі, ён адказваў характэрнымі жартамі або анекдотамі, якія цалкам разбуралі аргументацыю апанента і пераводзілі сімпатыі публікі на яго рэплікі.

Так, у 1983 годзе на адным з мітынгаў у адказ на вельмі тады папулярнае пытанне апанентаў «Што вы думаеце аб праблеме выжывання чалавецтва ў атамнай вайне?» Рэйган распавёў анекдот пра старога, які трапіў у кампанію спецыялістаў па атамнай энергетыцы. На іх пытанне, дзе б стары хацеў знаходзіцца падчас атамнага выбуху, той адказаў: «Усё роўна, дзе. Галоўнае, каб я мог сказаць — Ух ты! Што гэта!» Анекдот Рэйгана быў успрыняты лепш за доўгія і нудныя прамовы праціўнікаў.

Рэйган надаваў вялікае значэнне самаіроніі. Такім чынам ён выбіваў глебу з-пад ног сваіх крытыкаў, забіраючы іх любімыя тэмы. Ён часта і ахвотна смяяўся са свайго саліднага ўзросту. «Калі я быў хлопцам, перамагчы на прэзідэнцкіх выбарах было значна лягчэй. Тады ў складзе ЗША было толькі 13 штатаў», — неяк сказаў прэзідэнт.

Аднак рэйганаўскі гумар быў сродкам не толькі абаронча, але і атакуючым.

У 1980 годзе, у пачатку трэцяга туру дэбатаў кандыдатаў у прэзідэнты, Рэйган з'явіўся ў зале і, са здзіўленнем паглядзеўшы на свайго візаві Джымі Картэра, сказаў: «Блін, зноў ты!»

Падчас першай сустрэчы з Гарбачовым у Жэневе ён спачатку распавёў Міхаілу Сяргеевічу вядомы ў часы сухога закону савецкі анекдот пра двух алкашоў, якія стаяць у чарзе па гарэлку. Аднаму з іх гэта надакучыла, і ён адправіўся забіваць Гарбачова. Але праз нейкі час вярнуўся, бо чарга жадаючых забіць Міхаіла Сяргеевіча аказалася даўжэйшай.

Калі зайшла размова пра адаптацыю рэйганаўскіх жартаў у СССР, нельга не згадаць гісторыю, якая адбылася 13 жніўня 1984 года. Падчас рэпетыцыі выступу на тэлебачанні Рэйган пажартаваў, сказаўшы з трыбуны: «Дарагія амерыканцы! Толькі што я падпісаў законапраект, які назаўсёды пакончыць з Расіяй. Мы пачынаем яе бамбіць праз пяць хвілін». Запіс неяким чынам стаў публічным. У нас жарт не зразумелі і доўгі час згадвалі яго як ілюстрацыю каварных планаў Вашынгтону развязаць атамную вайну.

Яшчэ ў часы прэзідэнцтва Рэйгана палітычныя тэхнолагі аддавалі належнае гумару. У тэкстах усіх наступных прэзідэнтаў абавязкова можна сустрэць пару-тройку жартаў. Клінтан, Буш і Буш-малодшы нават самі спрабавалі жартаваць. І часам у іх гэта атрымлівалася. Аднак гэта не быў гумар ад душы. Рэйганаўскі гумар ствараў атмасферу камфорту кампаніі добрых знаёмых.

Напрыканцы прывяду яшчэ некалькі культавых жартаў ад вялікага палітыка: «Я заўважыў, што ўсе, хто выступае за аборты, ужо нарадзіліся»; «Я даў загад — тэрмінова разбудзіць мяне ў выпадку пагрозы нацыянальнай бяспецы. Нават калі я буду на пасяджэнні ўрада». А ў 1966 годзе на пытанне журналістаў, якім губернатарам Каліфорніі ён хоча быць, Рэйган адказаў: «Я не ведаю. Я ў кіно ніколі не быў губернатарам».

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### НІК ГРЫФІН

Па словах лідара Брытанскай нацыянальнай партыі (BNP), 5 лютага ў краіне пачалася эпоха «грыфінізацыі». На тое, па меркаванні Ніка, ёсць дзве прычыны. Па-першае, напярэдадні ў горадзе Лутоне адыбылася масавая дэманстрацыя ягоных прыхільнікаў, якая закончылася бойкай з тутэйшымі эмігрантамі-мусульманамі. Па-другое, прэм'ер-міністр Дэвід Кэмеран выступіў з прамовай пра крызіс палітыкі «мультыкультуралізму» (права кожнай этнічнай камуны на рэлігійна-культурную аўтаномію). Як лічыць Кэмеран, нацыянальныя камуны ў выніку аказваюцца ізаляванымі, у грамадстве адсутнічаюць агульныя каштоўнасці. Выйсцем з сітуацыі, на думку Кэмерана, мае быць стварэнне агульнай нацыянальнай ідэнтычнасці. Канкрэтным крокам ураду будзе падтрымка камунальных праектаў, у якіх удзельнічаюць прадстаўнікі розных этнічных і рэлігійных груп. Грыфін, зразумела, так не думае. Ён абяцае, што бліжэйшым часам BNP скажа сваё слова. Незалежныя палітолагі, між тым, мала вераць у тое, што Грыфін стане кумірам мас. Кэмеран пры ўсім жаданні не здольны хутка змяніць палітыку «мультыкультуралізму», якую Вялікабрытанія праводзіць ужо 30 год.



### НІКАЛЯ УЛО

Журналіст, які быў вядучым французскай версіі праграмы «Дзікая прырода», нечакана стаў адным з фаварытаў будучай прэзідэнцкай кампаніі. Нягледзячы на тое, што ён сышоў з тэлебачання яшчэ ў 1990-я гады, публіка паранейшаму яго любіць. Не дзіўна, што журналіста марылі ў свой час займець у свае каманды і правыя, і левыя. Так, Жак Шырак прапанаваў Уло пасаду міністра экалогіі. У 2006 годзе ў інтэрнэце быў створаны сайт прыхільнікаў вылучэння Уло кандыдатам ў прэзідэнты. Зварот да журналіста з заклікам стаць кандыдатам падпісалі 740 тысяч чалавек. Нікаля заклік праігнараваў. Увогуле, Уло доўга не мог вызначыцца, ад якой фармацыі яму ісці ў палітыку, пакуль нарэшце не далучыўся да Зялёных. Апошнія спачатку віталі з'яўленне ў сваіх шэрагах такога вядомага дзеяча. Зараз, аднак, відавочна, што Нікаля можа парушыць іх планы. Раней Зялёныя збіраліся высунуць на пасаду прэзідэнта ў 2012 годзе еўрадэпутата Еву Джалі. Аднак дадзеныя апошніх апытанняў сведчаць, што французы хацелі б бачыць кандыдатам ад эколагаў не Еву, а Нікаля, якому аддалі перавагу 61 працэнт апытаных (кандыдатуру Евы падтрымалі толькі 30 працэнтаў). Тое ж самае адбываецца ў партыі. Тут лічбы наступныя: 64 працэнты — за Нікаля і 34 працэнты — за Еву. Чым усё гэта скончыцца, пакуль не вядома. Варта згадаць, што раней кандыдаты ад Зялёных таксама карысталіся падтрымкай электарату. Але як толькі прыходзіў дзень выбараў, больш за 5 працэнтаў яны не набіралі.

### ФАЎЗІЯ БАЙРАМАВА



Лідар руху за незалежнасць Татарстану, вядомая ў краіне пісьменніца, выступіла з рэзкай крытыкай улад. Яна апублікавала свайго роду маніфест, які можа каштаваць ёй волі. У маніфесце Фаўзія заяўляе, што «расійскія ўлады праводзяць прыгнёт татарскага народа». Пра гэта, па меркаванні Байрамавай, сведчыць «забарона на вывучэнне татарскай мовы ў старшых класах школы». Дасталася ад Фаўзіі і татарскім прэзідэнтам за тое, што яны далі згоду на рэстаўрацыю рускага горада Свіяжска насуперак таму, што археолагі даказалі — на месцы Свіяжска ў часы Залатой Арды была татарская слабада Заяда. Напрыканцы Байрамава заклікала ўсіх татар не давяраць уладам і службоўцам. Фаўзія Байрамава ўжо мела праблемы з законам з-за сваіх выказванняў. Год таму яна была асуджана на адзін год умоўна за распальванне міжнацыянальнай розні і за распаўсюджанне тэкстаў радыкальнага характару. Пракуратура рэспублікі ўжо абяцала праверыць, ці ёсць у новым маніфесце экстрэмісцкія выказванні. Калі так, то ўмоўны год Фаўзіі можа стаць рэальным.

ЦІКАВА

# АРАБСКАЯ ДЖЭЙН ОСТЫН

## ЖАНОЧЫ ДОСВЕД УЗБУНТАВАНАГА ЕГІПТА

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**У верасні 2010 года часопіс «The Foreign Policy» апублікаваў рэйтынг найгоршых дыктатараў свету. «Хіба бываюць найлепшыя?» — здзівіліся беларускія блогеры, але рэйтынг сумленна передрукавалі. Чытаючы яго, я знаходзілася ў ЗША, у кампаніі 40 пісьменнікаў з розных куткоў планеты. Я супаставіла спіс нашай групы са спісам дыктатараў і выявіла, што ў атрыманым такім чынам рэйтынгу прыгнечаных творцаў знаходжуся на апошнім — чацвёртым месцы (Аляксандр Лукашэнка, нумар 22).**



Любімая справа егіпецкіх дзяўчат — змяшэнне стыляў. Гада Абдэлаалъ у Чайна-таўне Сан-Францыска




На трэцім месцы размясцілася абаяльная Бэвэрлі Пэрэц-Рэга з Венесуэлы (Уга Чавес — нумар 17 у дыктатарскім спісе). У дзень нашага знаёмства, пачуўшы ад мяне змоўніцкае: «Я з Беларусі», — Бэвэрлі па-змоўніцку ж рассмяялася і прамовіла: «Аміга!» — са стомленай іроніяй, уласцівай многім тутэйшым аматарам пагаварыць пра нашага «ўсенароднаабранага». Першае месца (Махмуд Ахмадзінеджад, нумар 8), належала кінасцэнарыстцы Фарангіз Сіягпур з Ірану. Перад паездкай у ЗША 27-гадовая дзяўчына прадала машыну і іншую каштоўную маёмасць. Яна са здзіўленнем адрэагавала на маё пытанне, ці збіраецца яна вяртацца на радзіму.

А вось на другім месцы атабарылася гераіня майго артыкула — трыццацігадовая Гада Абдэлааль, пісьменніца з Егіпта. Да свайго сораму, толькі пазнаёміўшыся з ёй, я даведалася, што сёння найстаражытнейшая дзяржава Ніла — адна з сумнавядомых у свеце дыктатур, а 82-гадовы Хосні Мубарак занесены ў ганебны спіс дыктатараў пад нумарам 15.

### «Фэйсбучная змагарка»

Менавіта так, з іроніяй, акрэслівае Гада свой удзел у Егіпецкай рэвалюцыі. На яе акаўнт у сацыяльнай сетцы падпісана прыкладна 5 тысяч карыстальнікаў. Магло быць болей, але сістэма не вытрымлівае. Мяне Гада падпісала «па блаце», як асабістую знаёмую яшчэ ў верасні. І цяпер, у студзені 2011-га, мая стужка навінаў рэгулярна стракаціць вяззю не заклікаў, абвестак, меркаванняў. Я і ўявіць сабе не магла, што ўсё абернецца менавіта так, і ў дні, калі гэтай вязі не будзе з'яўляцца ў інтэрнэце, я з хваляваннем пачну глядзець прамую трансляцыю тэлеканала «Аль-Джазіра»...

Сярод усіх пісьменніц, якія пасябравалі міжсобку цягам праграмы (і жыхарак недэмакратычных краінаў, і прадстаўніц дэмакратычнага свету), Гада — самая вялікая зорка. Прычым як у нашай групе ў ЗША, так і дома, у Егіпце. У Амерыцы яна, да жаху некатoрых амерыканцаў, прынцыпова насіла хіджаб, хоць законы ісламу ў яе краіне дазваляюць не рабіць гэтага («Гэта мой персанальны выбар!») і актыўна ўдзельнічала ва ўсіх публічных дыскусіях на тэму «Іслам у сучасным свеце», у кульмінацыі якіх гарэзліва выскоквала з-за стала ці трыбуны, паказваючы амерыканцам свае джынсы («Усе дзяўчыны ў Егіпце так ходзяць!»). Паездка літаратараў на галоўнае радзе штату Аявa ператварылася ў прыгодніцкі фільм пад назвай «Праўдзі на ранча дзяўчыну ў хіджабе». Як на тое, радза прызначылі на балючую для народа Амерыкі дату 11 верасня, увесь тыдзень напярэдадні па галоўных каналах краіны ішлі дэбаты, паліць ці не паліць Каран, і мэнэджэры літаратурнай праграмы некалькі разоў настойліва параілі Гадзе не ехаць («Мы не зможам абараніць цябе»). Але гордая егіпцянка сказала, што мае права, бо для яе, замежніцы, радэа — экзотыка, і тады група пачала прыдумваць, чым іншым, апроч хусткі, закрыць яе валасы (аргенцінка: «Я знайшла табе кепку! Будзеш, як фермер!!!»).

На радзіме Гада тры дні на тыдзень працуе фармацэўтам у адной з аптэк маленькага гарадка ў дэльце Ніла (дзве гадзіны ад Каіра), а астатні час бавіць напісаннем калонак для газет ды часопісаў, раздаваннем інтэрв'ю і сустрэчамі з літагентамі, выдаўцамі і прадзюсарамі. Гада — літаратарка, якая адкрыла свой талент з дапамогай блогінга. Яна — новы феномен маладога Егіпта, кажа пра яе заходняя прэса. Прыклад таго, як інтэрнэт перавярнуў жыццё ў 80-мільённай краіне.

Што да асабістага жыцця, то Гада — тыповая маладая жанчына ў ісламскім свеце. Сем гадоў таму памерла яе маці, і цяпер яна — гаспадыня дома, даглядае бацьку і брата. Не замужам.

### «Хачу замуж!»

У выпадку Гады такое шчырае жаданне ўсіх нас незамужніх — не проста крык душы, а творчая канцэпцыя і амаль палітычны лозунг. Такую назву мае яе раман, які выйшаў друкам у 2008 годзе. Раман быў складзены з запісаў яе блогу, які на дадзены момант чытае паўмільёна карыстальнікаў арабскага сегмента інтэрнэта. Каб дабіць нас усіх танцам жывата, Гада таксама стала сцэнарысткай тэлесерыяла паводле свайго рамана. У 2010 годзе серыял «Хачу замуж!» ішоў штодня цягам месяца Рамадан (рамаданны серыял — адмысловы жанр на арабскіх тэлеканалах) і займаў першыя радкі ў тэлерэйтынгах.

З дапамогай сэціва нязгодныя з сацыяльна-эканамічнай сітуацыяй у Егіпце, Тунісе, Йемене і ў іншых ісламскіх краінах аднадумцы атрымалі магчымасць кансалідавацца, супольна заявіць пра свае праблемы і пачаць патрабаваць іх вырашэння. Што і дазволіла аналітыкам назваць палітычныя хваляванні ў арабскім свеце «Фэйсбук-рэвалюцыяй». Адну такую праблему, на першы погляд, зусім далёкую ад палітыкі, у 2005 годзе ўзняла і Гада Абдэлааль.

### «Кажыце свае бісмілахі»

Так яна пачала свой першы запіс у інтэрнэт-дзённіку. У перакладзе з егіпецкага на беларускі моладзевы слэнг гэта магло б гучаць як: «Давайце сюды рышпекты». Ці, хутчэй, «З Богам, народ!» Бяслаўленнем «бісмілах» («У імя Алаха») мусульмане пачынаюць важную для іх справу. Схаваўшыся пад англамоўным нікам Bride (Нявеста), Гада ўзялася ў сатырычнай форме апісваць пыхлівых неадукаваных жаніхоў, якіх прыводзілі ў яе дом сваxі. «Ты апісала ўсіх дзесяць?» — сказала я, прачытаўшы англійскі пераклад кнігі. «Ха! Дзесяць! Іх было сто дзесяць! Гэта толькі самыя каларытныя выпадкі! Ты не ўяўляеш, які там сабраўся паноптыкум».

Але аб'ект сатыры ў кнізе Гады — не егіпецкія няздары мужчынскага полу, а тыя традыцыі, якія робяць дзяўчыну пасіўнай удзельніцай шлюбу. У кансерватыўных мусульманскіх асяроддзях асноўная місія жанчыны — выйсці замуж і нарадзіць дзяцей. Але незамужняя дзяўчына не можа займацца актыўным пошукам будучага мужа — гэта непрыстойна. Рытуал шлюбавання пачынаецца з таго, што сваты з жаніхом прыходзяць у гасцёўню сям'і патэнцыйнай нявесты і абсядаюць такія характэрныя ўсходнія канапы, якія можна сустрэць і ў Беларусі. Прыкладна гадзіну абедзве сям'і робяць выгляд, што проста міла гутараць. За гэты час маладыя людзі павінны прыняць рашэнне, ці стварыць ім сям'ю.

Добра, што ў Егіпце дзяўчына мае законнае права не толькі насіць джынсы, але і насуперак волі бацькоў адмовіць жаніху, калі той не спадабаўся. «Вы нават на пікнік разам не пойдзеце з чалавекам, якога бачыце ўпершыню ў жыцці. Што ўжо казаць пра замуж?» — абураецца Гада. Усіх сваіх кавалераў яна з бацькоўскай гасцёўні выгнала. Тое самае, на радасць чытачам, прарабіла яе лірычная гераіня ў інтэрнэце.

Блог атрымаў шалёную папулярнасць і падтрымку жанчын усяго арабскага свету: «Нявеста, ты пішаш праўду. У мяне — тое самае!» — такіх водгукаў у Гады тысячы. Каментуюць яе і мужчыны, якія кажуць, што падтрымліваюць сваіх сясцёр у іх нежаданні звязваць лёс з выпадковымі людзьмі.

### «У Егіпце больш жанчын, чым мужчын»

Так піша Гада пра гендэрны крызіс у краіне. «Гэта бясспрэчны факт, — працягвае яна, — няхай хлусліная дзяржаўная статыстыка сцвярджае, што нас пароўну. (...) Чаму? Я раскажу вам. Праблема ў тым, што жанчыны нараджаюць дзяцей, пакуль не з'явіцца хлопчык. Вы самі ведаеце багата сем'яў, дзе чатыры сястрычкі і брацік, пяць сястрычак і брацік, шэсць сястрычак і брацік... Жанчына цяжарыць да часу, пакуль яе муж-подзеўбень не займее сына! Што такога карыснага ў сыне? Няясна. (...) Любы, хто вучыўся ў егіпецкім універсітэце, заўважаў: дзяўчат сярод студэнтаў болей. У маім універы на аднаго хлопца прыходзілася дзве дзяўчыны».

У выніку, піша Гада, хлопцы зазнаюцца і паводзяць сябе як шэйхі. Яны лёгка атрымліваюць спадчыну і прамоўваюць яе (але ж, паводле традыцыі, мусілі б утрымліваць незамужніх сясцёр), а да выбару нявесты падыходзяць з завышанымі патрабаваннямі. Безліч маладых егіпцянак сёння застаецца «старымі дзевамі». Што ёсць ганьбай. «Чатырохгадовых хлопчыкаў пытаюцца, кім яны хочуць стаць, калі вырастуць. Дзяўчат таго ж веку пытаюцца, якога б яны хацелі мужа. І калі яны вырастаюць і па розных прычынах не могуць гэтага мужа займець — ім што, спаліць сябе?»

Энергія і сарказм стылю Гады абразілі некаторых мужчын-чытачоў яе блогу: «Гэта непрыстойна. Мусульманка не мае права нават заікацца пра такія рэчы!» Калі ў пісьменніцы пытаюцца, ці не няўдачлівыя жаніхі пісалі гэтыя каментары ў інтэрнэце, яна смяецца: «Ды я б выйшла замуж за любога з іх, хто ведае слова «інтэрнэт»!»

Уся гэта дзявочая валтузня спараджае адно пытанне:

### «Пры чым тут Хосні Мубарак?»

Шлюб у Егіпце — эканамічнае прадпрыемства. Жаніх не мае права сесці на канапу будучай цешчы да часу, пакуль не зможа прапанаваць абранніцы «махр» — багата абсталяваную кватэру, і «шабку» — дарагія ювелірныя ўпрыгожанні. У краіне, дзе 90% працаздольных мужчын — беспрацоўныя, заканыя пары часта не маюць магчымасці ажаніцца. Менавіта таму пры дазволеным шматжонстве рэдкі мусульманін можа мець больш за адну сужэнку — кватэр трэба купляць кожнай! (Некаторыя цынікі менавіта гэтым тлумачаць феномен «рускіх Наташаў», якія выходзяць замуж у Егіпет: славянскія дзяўчаты папросту не ў курсе, што ім належыць «махр» і «шабка»). У гэтыя студзеньскія дні на плошчы Тахрыр не толькі бурчаць галодныя страўнікі, але і граюць гармоны. Але мая сяброўка Гада вельмі расстроеная тым, што адбываецца. Яна заклікае мітынгоўцаў: «Спыніцеся!» Пратэсты не павінныя працягвацца, бо пад пагрозай жыццё рэвалюцыянераў і дабрабыт іх сем'яў.

Колы, адпаведныя нашым Саюзам пісьменнікаў, не палічылі твор Гады за літаратуру. Яна піша егіпецкім дыялектам арабскай мовы, у той час, як літаратар павінен карыстацца чыстай, без дамешкаў мовай Карану. «І ўвогуле, у мяне не сівыя валасы і я — жанчына! Гэта непарадак!» — кпіць Гада з пажылых крытыкаў. Але яе папулярнасць ніяк не залежыць ад меркавання аксакалаў. Кніга «Хачу замуж!» вытрымала 11 перавыданняў, была перакладзеная на некалькі еўрапейскіх моваў. У Еўропе і ЗША яна ўспрымаецца не як масавае чытво, а як маніфест памяркоўнага ісламскага фемінізму. Голас жанчыны, якая хоча вырашаць свой лёс сама. На Захадзе Гаду Абдэлааль параўноўваюць з Джэйн Остын, а яе кнігу — з «Дзённікам Брыджыт Джонс» Хелен Філдынг. Хоць сама дзяўчына ніколі не чытала гэтых англійскіх пісьменніц. Што ж, здаецца, я маю для Гады падарунак на вяселле, якое абавязкова адбудзецца!..

ФЕСТЫВАЛІ

# ДОБРАЯ НАВІНА ДЛЯ «ТАЎКАЧЫКАЎ»

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**«Таўкачыкі» — традыцыйны беларускі фолк-фестываль, які абавязаны сваім узнікненнем і канцэртнаму жыццю аднаму чалавеку — музыканту і прадзюсару Юрыю Выдронку.**

Фэст меў статус незалежнага і ўсю сваю гісторыю існаваў з фінансавай і арганізацыйнай дапамогі асоб і арганізацый, якія былі зацікаўленыя ў развіцці нацыянальнай культуры, у прапагандзе песеннай спадчыны нашага народа. «Таўкачыкі» займелі станоўчы водгук у прэсе, у асяродках прафесіяналаў і знаўцаў нацыянальнага фальклору як феномену сучаснага музычнага мастацтва. Не заўважаць яго ўплыў на сучасны фальклор у розных яго вымярэннях стала немагчыма. Вынікам папулярнасці гэтай музычнай падзеі стала тое, што цяпер фолк-фэст «Таўкачыкі ад Юрыя Выдронка. Зімовыя святкі» быў упершыню падтрыманы Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

Канешне, гэтая акалічнасць стала для Юрыя Выдронка, для яго аднадумцаў вельмі добрым падмуркам для рэалізацыі новых фестывальных ідэй. Бо патранат Міністэрства культуры абяцаў новыя магчымасці ў рэалізацыі даўніх задум Юрася адносна захавання нацыянальных песенных скарбаў, а таксама распрацоўкі новых форм існавання і фіксацыі нацыянальнага фальклору ў сучасных умовах. Але падтрымка дзяржавы незалежнага фэсту магла азначаць і ціск на яго арганізатараў як па змесце фестывальных канцэртаў, так і па складу ўдзельнікаў. Таму многія шматгадовыя наведвальнікі «Таўкачыкаў» з трывогай ішлі ў канцэртную залу Беларускай дзяржаўнай філармоніі з думкамі: ці не ператварыліся «Таўкачыкі», незалежны фолк-фэст, у «мерапрыемства» кшталту «Славянскага базару» ці «Дажынак»?

Але першыя ж акорды фэсту адкінулі нашы трывогі. Фармат фестывалю як вольнай канцэртнай пляцоўкі для прэзентацыі розных форм існавання беларускага фальклору не быў зменены. Традыцыйна для «Таўкачыкаў» фестываль распачаўся фолкрокам з фірменным гучаннем этна-рок-шоў «UR'IA», што спалучалася з традыцыйнымі спевамі. Напоўніць залу Белдзяржфілармоніі незвычайнымі мелодыямі і гармоніямі, у якіх загучала традыцыйная песня «Шчодры вечар», дапамаглі Выдронку і яго гурту ўдзельніцы фальклорна-этнаграфічнага гурта з вёскі Ольніца Глускага раёна Магілёўскай вобласці. Далей эксперыменты працягнуліся яшчэ з большым драйвам, што адразу адбілася на настроі слухачоў. Яны з цікавасцю назіралі за цудоўнымі строямі, у якія былі апранутыя артысткі гурта «UR'IA». Як высветлілася пазней, гэтыя касцюмы паводле здымкаў з фотаальбома Міхася Раманюка ўзораў давыд-гарадоцка-тураўскага строю XVIII–XIX стагоддзяў аднавіла ўдзельніца гурта і дызайнер Вольга Рыжкова. І яшчэ адна неспадзяванка гэтага фестывалю: гурт «UR'IA» прадставіў свой абноўлены склад, які гэтым разам атрымаў сапраўднае музычнае «хрышчэнне». Яго цяперашнія ўдзельнікі ўпэўнена і якасна адыгралі рэпертуар, што быў створаны пад сталых прафесійных выканаўцаў, што цяпер па розных прычынах саступілі месца ў «UR'IA» больш маладым.





Ідэя інда-еўрапейскай часткі выступлення «UR'IA» палягала ў тым, каб пад мелодыю гурта, якая дала назву аднаму з альбомаў — «Калі-чакра», — яшчэ раз прадэманстраваць слухачам непарыўную гістарычную сувязь індыйскай і беларускай культур. Пад незвычайна для еўрапейскага слухача гарманізаваную і рытмізаваную канву «Калі-чакры» сваё харэаграфічнае майстэрства прадэманстравалі ўдзельніцы гурта «Індывара» — адданыя прыхільніцы індыйскай культуры. Дарэчы, у адрозненне ад мінулага года, калі «Індывара» прадстаўляла ўзоры індыйскіх танцаў «сола», у гэтым годзе імі была створана сумесная з вакалісткамі «UR'IA» харэаграфічная кампазіцыя стылю Бхаратанацьям. Яркае па каляровай гаме, дынамічнае музычнае шоў з вялікім захапленнем было сустрэта слухачамі апладысментамі.



Многія прыхільнікі і наведвальнікі «Таўкачыкаў» ведаюць іх унікальную асаблівасць — у праграме фэсту абавязкова будзе прадстаўлены ўзоры аўтэнтычнай народнай творчасці, з якімі нельга пазнаёміцца ні на іншых фестывалях, ні з праграм радыё, ні на тэлебачанні. Распачаць фестывальныя зімовыя святкі было даручана мінулагоднім удзельнікам «Таўкачыкаў на Дзяды» — фальклорнаму ансамблю сярэдняй школы №3 горада Мінска пад кіраўніцтвам С. Яфімавай. І хоць «школьныя» калядкі былі ўзноўлены паводле этнаграфічных крыніц, дзіцячая непасрэднасць і яскравасць не маглі не расчуліць сэрцы слухачоў, якія шчырымі апладысментамі аддалі належнае маленькім калядоўшчыкам. Адзін за адным на сцэну выходзілі этнаграфічныя гурты з вёсак Закальное, Обчын Любанскага раёна Мінскай вобласці, Дуброва Глускага раёна Магілёўскай вобласці.

Стала відавочна, што гэтым разам арганізатарамі фэсту была зроблена не толькі своеасаблівая панарама народнай творчасці, а сапраўднае спеўнае спаборніцтва, ці, паводле сучаснай тэрміналогіі, батл этнаграфічных гуртоў! Бо кожны з іх адстойваў выканаўчы гонар свайго рэгіёну, імкнуўся давесці прыдзірлівай сталічнай публіцы сваю адметнасць і непаўторнасць. Таму калядныя спевы суправаджаліся старажытнымі абрадамі з нязменнымі героямі народнага эпасу — Звездаром, Казой, Мядзведзем, вясёлымі калядоўшчыкамі з пачастункамі, гульнямі, спевамі і тэатралізаванымі сцэнкамі. Светлыя твары простых жанчын, што з такім захапленнем спявалі для мінчан песні сваіх матуль і бабуль, яшчэ раз нагадвалі пра нашу адказнасць за захаванне агульнай нацыянальнай спадчыны.

Сапраўдны фурор на гэтым фестывалі здзейсніў фальклорны гурт «Мотальскія суседзі» пад кіраўніцтвам Эльміры Каткавец. Сапраўды, шчырыя і вынаходлівыя мотальцы пацвердзілі высновы, якія ў сваім рамане «Пакутны век» зрабіў Васіль Якавенка. Пісьменнік адзначыў: жыхары Моталя, якія «лічылі сябе грамадзянамі Вялікага Княства Літоўскага... у зносінах з шырокім светам вызначаліся добрым норавам і кемлівасцю...» Цікава, што ў складзе «Мотальскіх суседзяў» шмат моладзі, яна, відавочна, шануе сваю спадчыну, якая мае сваю палескую адметнасць як у мове, так і ў мясцовай трактоўцы агульнабеларускіх фальклорных каранёў.

Міжнародны статус фестывалю заўсёды надавалі госці, якія ў розныя гады правядзення фестывалю завітвалі да нас з Польшчы, Украіны, Літвы. Гэтым разам еўрапейскі кантэкст канцэрта ўзмацніла сваімі меладычнымі спевамі чароўная госця «Таўкачыкаў» са Швецыі — спявачка Сафія Юліўсдотэр (Sofia Jliusdotter), якая пазнаёміла слухачоў з фальклорнымі напевамі гэтай суровай, але прыгожай паўночнай краіны, а таксама выканала некалькі найгрышаў на шведскай флейце. Яе надзвычай высокі голас і вытанчаныя лірычныя мелодыі выклікалі сапраўдныя авацыі беларускіх слухачоў.

Па традыцыі, сцэна фестывалю была аддадзена сталым і маладым фолк-мадэрн-гуртам, якія прадставілі разныя адгалінаванні гэтага папулярнага ў Беларусі музычнага накірунку. Сваю праграму слухачам прадэманстравалі ўдзельнікі гурта «ALTANKA». Трэба заўважыць больш дасканалае вакальнае ўвасабленне кампазіцый, а таксама беларускую мову, якую пачаў выкарыстоўваць фронтмэн «ALTANKA» Дзмітрый Лук'янчык падчас вядзення канцэрта. Акрамя гэтага, наведвальнікі фестывалю зноў апладысментамі адзначылі віртуознае выканаўчае майстэрства музыкантаў гурта.

Цэльнае ўражанне пакінуў пасля свайго выступлення і гурт «BETAX». Адразу было бачна, што музыканты зацікаўленыя ў тым, каб пра «BETAX» казалі як пра стыльную фолк-каманду, як у сцэнічных касцюмах, так і па рэпертуару. Застаецца пажадаць цікавым выканаўцам больш актыўна ўдзельнічаць у фэстах і канцэртах дударскай тэматыкі (у складзе гурта два дудары), а таксама адмаўляцца ад рэпертуарных штампаў, шукаць сваю непаўторную тэматыку на сучаснай фальклорнай сцэне.

Як заўжды, фестываль «Таўкачыкі ад Юрыя Выдронка. Зімовыя святкі» завяршыўся на рок-хвалі. Яе «нагналі» ў залу Дзяржаўнай філармоніі вядомы фолк-рок-гурт «Бан-Жвірба» з Гомелю і сам Юрый Выдронак са сваёй камандай. Але сучасныя аранжыроўкі, фарсіраваны гук гітар і рок-вакал не супярэчылі таму, што гучала ў выкананні этнаграфічных ансамбляў і гуртоў. Бо, як справядліва заўважыў калісьці музыкант гурта «Led Zeppelin» Джымі Пэйдж, рок — гэта і ёсць фальклор сучаснасці...

«Таўкачыкі–2011» сталі гістарыяй айчыннага фестывальнага руху. Відавочна, што з падтрымкай яго арганізатараў Мінкультам перспектыва фестывалю цяпер набыла новыя абрысы. Ведаю, што ў Юрыя Выдронка шмат ідэй і задумак, каб зрабіць яго фэст агульнабеларускім фальклорным святам. Цяпер усе яны маюць добры шанец ажыццявіцца.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# XVIII МІНСКІ КНІЖНЫ КІРМАШ

Аляксей ХАДЫКА

**9 лютага ў павільёне НВЦ «БелЭкспа» адкрыўся XVIII Мінскі міжнародны кніжны кірмаш-выстава.**

Як заўсёды, адна з замежных краін выступае на ім як ганаровы госць. Гэтым разам цэнтральнае месца пад слоганам «Багацце фарбаў і адценняў» заняла Германія.

Але пасля 19 снежня ў Беларусі рознакаляровае багацце вызначаецца і багаццем скандальных сітуацый. Байкатаваць мінскую выставу заклікалі вядучыя ўкраінскія пісьменнікі і журналісты. Следам за імі ад удзелу ў мерапрыемстве адмовілася буйнейшае маскоўскае выдавецтва «Время», якое на папярэдніх кірмашах радавала беларусаў выданнямі нашых пісьменнікаў. Гэтым разам «Время» рыхтавалася правесці прэзентацыю кнігі вершаў Уладзіміра Някляева «Окно» з прадмовай Яўгена Еўтушэнкі. Але генеральны дырэктар выдавецтва Барыс Пастарнак, зазначыўшы, што прымае хутчэй эмацыйнае, чым рацыянальнае рашэнне, удзел свайго прадпрыемства ў кірмашы скасаваў. «Неяк не па-людску праводзіць прэзентацыю кнігі Някляева ў некалькіх кіламетрах ад месца, дзе паэт сядзіць пад хатнім арыштам», — зазначыў ён.

Колькасць удзельнікаў у выставе, аднак, досыць значная — 120, і падзея мусіць зрабіцца прыкметнай у інтэлектуальным жыцці краіны. Ёсць станоўчыя моманты: упершыню за некалькі год, скааперавашыся на адно агульнае выставачнае месца памерам 2 квадратных метры (і коштам 250 еўра), у кірмашы бяруць удзел недзяржаўныя беларускамоўныя выдаўцы. Гэта выдавецтвы «Логвінаў», «Галіяфы», «Лімарыюс», выдавец Зміцер Колас, «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына», а таксама рэдакцыі часопісаў «ARCHE-пачатак», «Дзеяслоў» і «pARTisan». У іх аб'яднанні ёсць рацыянальнае зерне: кожны з іх паасобку выдае не надта многа пазіцый у год. А разам яны прапануюць цэлую бібліятэку. Аўтары невялікага стэнду — Алесь Разанаў, Альгерд Бахарэвіч, Адам Глобус, Валянцін Акудовіч, Уладзімір Арлоў, Андрэй Хадановіч, Артур Клінаў, Валер Булгакаў, Анатоль Вярцінскі, Арцём Кавалеўскі, Зміцер Вішнёў, Наталка Бабіна, Вера Жыбуль і іншыя знаныя беларускія літаратары.

Прысутнасць недзяржаўнага сектару не абмяжоўваецца гэтым стэндам, які арганізатары, дарэчы, адправілі ў нязручнае месца пад лесвіцу, што вядзе на другі паверх. У больш выгадным месцы побач са стэндамі ЗША і Швейцарыі размясціўся стэнд выдавецтва «Энцыклапедыкс», дзе таксама можна набыць нумары часопіса «Спадчына». І аформіць падпіску на газету «Новы час».

З 9 па 13 лютага наведвальнікаў кірмашу чакаюць разнастайныя сустрэчы і прэзентацыі. Закрыццё выставы і ўручэнне прызоў XVIII Мінскага міжнароднага кніжнага кірмашу — 13 лютага а 15-й гадзіне.

АГЛЯД

# ЖЫВЫЯ ЛЮДЗІ Ў ЖЫВАПІСЕ І ФОТА

Аляксей ХАДЫКА

**Працягваючы выставачны марафон, прысвечаны 85-годдзю старэйшыны мастацкай дынастыі Аракчэевых — знакамітага жывапісца і выкладчыка Барыса Уладзіміравіча, следам за экспазіцыяй у беларускім МЗС адчыніліся выставы бацькі і яго дачкі, Аксаны Барысаўны, у Палацы мастацтваў. Наведаць сямейны паказ, які займае верхні паверх палаца, можна да 17 лютага.**





Самае цяжкае, што суправаджала адкрыццё экспазіцыі патрыярха беларускага жывапісу, — зрабіць адбор палотнаў. За доўгае творчае жыццё ў майстэрні і розных калекцыях іх назбіраліся сотні. А піша Барыс Уладзіміравіч не толькі якасна, але і з вялікім манументальным размахам. Ягоныя козыры — пластыка і колер, якія пераўтвараюць рэалістычнае мастацтва з моцнымі акцэнтамі суровага стылю ў сапраўднае свята для вачэй эстэта. Такія палотны, як краявід Мінска ў бэзава-сініх адценнях, намаляваны яшчэ ў 1970-я гады, — прадчуванне каларызму сённяшняй віцебскай школы на чале са Скавародкам.

Невыпадкова імпрэзу наведаў міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў — такі жывапіс можа быць візітоўкай краіны на міжнародных паказах. З'яўленне Мартынава было тым больш лагічным, што ў суседняй экспазіцыі дачкі Аракчэева Аксаны, якая выставіла партрэты, прысутнічалі вобразы адразу двух паслоў, абодвух кавалераў Мальтыйскага ордэна, — чэшскага амбасадара Іржы Караса (які наведаў адкрыццё выставы) і прадстаўніка ордэна ў Беларусі Пауля Фрыдрыха фон Фульхера.

Аксана Аракчэева звярнулася да сістэматычнага пісання партрэтаў толькі два гады таму, але жывыя вобразы, схопленыя спачатку ў замалёўках вугалем, а потым пераведзеныя ў каляровыя графічна-жывапісныя тэхнікі, робяць незабыўнае ўражанне. Можа, самым удалым на выставе з'яўляецца партрэт трэцяга «мальтыйца» ў Беларусі — мітрапаліта Мінска-Магілёўскага, арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча. Але ў шэрагу вобразаў — не толькі духоўныя асобы і дыпламаты. Багата аблічча мастакоў, супрацоўнікаў музеяў, акцёраў, проста прыгожых людзей.

У той самы дзень у Палацы мастацтва сваю творчасць прадставіў таксама мастак Яўген Ждан — ад тэатральных сцэнічных эскізаў часоў працы ў Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі да сучасных партрэтаў, краявідаў, нацюрмортаў і рэлігійных абразоў у своеасаблівым дэкаратыўна-графічным, з яркімі колерамі, стылі.

Залу 70-гадовы мастак падзяліў са скульптурнымі работамі Валерыя Калясінскага, сярод якіх вылучаюцца накіды да коннага манумента Стэфана Баторыя, помніка, які ўжо закуплены ўладамі Гродна і мусіць быць усталяваны ў горадзе на Нёмане. У далёкай зале Палаца ў тыя ж тэрміны (2–17 лютага) экспануюцца творы спадкаемцы абстракцыйнага стылю Казіміра Малевіча і УНОВІС віцебскай мастачкі і педагога Галіны Васільевай — справаздача за апошнія 15 год працы.

Нарэшце, на іншым баку праспекта Незалежнасці ў Галерэі «Ў» з 5 па 26 лютага дэманструецца серыя выразных партрэтных фотаздымкаў вядомага маскоўскага фатографа Ігара Ганжы «Жывыя людзі». Адкрыццё праекта суправаджалася прэс-канферэнцыяй і прыёмам з удзелам некаторых герояў фотапартрэтаў — пераважна прадстаўнікоў багемы, сябраў клуба «Сноб», — тых, паводле вызначэння аўтара, «людзей, якія актыўна ўздзейнічаюць на навакольнае асяроддзе, фармуюць вакол сябе культурны і грамадскі ландшафт, ствараюць тое, што мы зазвычай называем атмасферай».

Але тое, што паказана ў экспазіцыі, — мастацтва зусім не «багемнае». Гэта ў лепшым сэнсе выразная і моцная чорна-белая фатаграфія, за выключэннем некалькіх каляровых здымкаў. Да выставы, дарэчы, выдадзены шыкоўны каталог, куды ўвайшлі і тыя працы, якія не змясціліся ў экспазіцыю. Ёсць чаму павучыцца: і ў сэнсе майстэрства работ, і ў сэнсе арганізацыі зусім не шэрагавага выставачнага мерапрыемства.

ОСКАР

# ЧОРНЫЯ ЛЕБЕДЗІ Ў ЧАКАННІ

Андрэй РАСІНСКІ

**Сталі вядомыя намінанты на сёлетні «Оскар».**

Сярод намінантаў на лепшую карціну — жорсткі прыгодніцкі фільм Дэні Бойла «127 гадзін» пра чалавека, які выбраўся з пасткі, адрэзаўшы сабе руку. Суворая спартовая драма Дэвіда Расэла «Знішчальнік» працягвае тэму актыўнай барацьбы (сем намінацый на «Оскар»).




Кампанію змагарам складае «Чорны лебедзь» Дарэна Аранофскі пра балетныя жарсці. Гераіня стужкі Наталі Портман, нягледзячы ні на што, караскаецца наверх. Трылер «Зімовая костка» Дэбры Гранік лагоднасці таксама не мае. А браты Коэн вылучыліся з вестэрнам «Жалезная хватка».

Суворую атмасферу разбаўляюць гістарычная драма Тома Хупера «Кароль прамаўляе», камедыя Лізы Халадзенка «Дзеткі ў парадку» і анімацыя «Цацачная гісторыя 3». Апошняя стужка была ў нашым пракаце, як і два іншыя намінанты: «Сацыяльнае сеціва» Дэвіда Фінчэра і «Пачатак» Крыстафера Нолана.

Пераможцы будуць абвешчаныя 27 лютага на ўрачыстай цырымоніі.

З НАГОДЫ

# П'ЕСУ КУРЭЙЧЫКА ВЯЗУЦЬ У МІНСК

Андрэй РАСІНСКІ

**13 лютага ў кінаканцэртным зале «Мінск» адбудзецца прэм'ера камедыі «Ілюзіён» Андрэя Курэйчыка. Пра гэта паведаміла прэс-служба драматурга.**

П'еса прывезена ў сталіцу з Масквы. Упершыню яна была пастаўлена ў тэатры імя Маякоўскага сем гадоў таму, дзе ішла з аншлагамі. Гэта гісторыя пра сяброў, якія вырашылі стварыць цыркавую трупу.

У п'есе іграюць расійскія акцёры Міраслава Карповіч, удзельніца серыялу «Татавы дочкі» Анастасія Сіваева, Ганна Куркова (з фільма «Ранеткі»), Сяргей Дзьячкоўскі, Міхаіл Багдасараў і Аляксандр Лянькоў.

Курэйчык адзначае: «Сама тэатральная трупа ў нечым нагадвае герояў і сюжэт маёй п'есы». Пад акцёраў адмыслова была зроблена новая рэдакцыя камедыі.

П'есу «Ілюзіён» раней у Мінску не бачылі. Пачатак спектакля а 19 гадзіне.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 148

Падпісана да друку 11.02.2011. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.